№ 8 (318) 28 лютага 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Забойства Сталіна



Беларускі замах на тырана.

старонкі 12–13

### Як добра, што мы выміраем

Эканаміст Уладзімер Калупаеў — на карысьць дэмаграфічнага спаду.

старонкі 2, 14

### Новая кніга Зянона Пазьняка

Таемная місія.

старонка 2

### БНФ перайшоў на расейскую

Выбары: Маладэчна, Глыбокае, Барысаў, Баранавічы...

старонкі 3–4

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

## Выхад з паліклінічнай сьмерці

У маёй акрузе шмат праблемаў. Сярод іх ёсьць унівэрсальныя (дворнічыха больш п'е, чым працуе; алькагалізаваная частка насельніцтва пужае дзяцей; ад квартплаты няма ратунку) і спэцыфічныя. Прызнаюся, што вырашэньня першых ад мясцовых уладаў я не чакаю. Можаце лічыць мяне добра паінфармаваным аптымістам.

Спэцыфічныя ж праблемы, па вялікім рахунку, не такія і спэцыфічныя. Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта забрала пад свае пільныя патрэбы дзіцячую паліклініку, і цяпер даводзіцца вазіць малых за блізкі сьвет. У каго няма сваёй машыны, той можа выбіраць між таксоўкай і грамадзкім транспартам зь перасадкаю. У перапоўненай паліклініцы пануе такі гармідар, што, даставіўшы сваё немаўля ў кабінэт хірурга пасьля дзьвюх гадзінаў чаканьня ў чарзе, немагчыма не адчуць радасьці бацькоўства. Дарэмна! У пані дакторкі перапынак на абед (чаму гэта я не магу дазволіць сабе абедаў а 12-й дня?), бо «ў кабінэце невыносна душна і яго неабходна праветрыць». І жонка мае рацыю: трэба цярпець. Ёй, цяжарнай, у «дарослай» паліклініцы яшчэ і ня так прыкра было — выстойваць гадзіну на аналіз крыві.

Я цярплю. Але хачу сатысфакцыі. Я прагаласаваў бы за таго кандыдата, які дамогся б вяртаньня паліклінікі ад кіраўнікоў справаў — дзецям. Я прагаласаваў бы за кандыдата, які даў бы рады дырэктарцы нашай школы. Бо ганьба цягнуць з бацькоў столькі хабару. Я прагаласаваў бы за кандыдата ад «Зубра», бо «зубры» зьбіралі подпісы супраць канфіскацыі паліклінікі. Але «зубра» ў бюлетэні няма. Акрамя прадстаўніка блёку дактароў і беспартыйных, там яшчэ чатыры прэтэндэнты, прычым два — ад апазыцыйных партый. Вось толькі праграма ва ўсіх — як пад капірку. Калі сьціпла і ў перакладзе на людзкую мову — «За лепшую долю». Ці, калі ў арыгінале, — «Наши дети достойны лучшей жизни». Ні пра паліклініку, ні пра школу, што зьехала з глузду на рынкавых рэйкі, кандыдатам, здаецца, невядома. А каб іх халера зьела, такіх кандыдатаў...

Дэмакратыя ў Беларусі выйдзе з комы тады, калі выбарцы навучацца галасаваць супраць усіх. Асабліва калі кандыдат адзін. Або кланаваны адзін. Безумоўна супраць — калі ён адзін!

Раз няма за каго галасаваць, трэба галасаваць супраць. Не рабіце выбару між кепскім і яшчэ горшым. З галасаваньня супраць пачынаецца сьвядомы грамадзянін і грамадзянская супольнасьць.

**Андрэй Дынько**

# Аголеная Беларусь

**У часы, калі адзіным ухваленым відам каханьня была «любоў да вялікай Родзіны», за схаванае пад матрацам заходняе выданьне эратычнае скіраванасьці можна было трапіць на прафіляктычна-вэрбавальную гутарку ў «органы». Калі «вялікая Родзіна» пачала аганізаваць, попыт на эратычна-парнаграфічную прадукцыю ў Беларусі задавальняўся польскімі часопісамі. Іх прывозілі з базараў Варшавы ды Беластоку. Пасьля рынула расейская паліграфічная прадукцыя адпаведнага кшталту. Беларускага эратычнага часопісу дагэтуль няма. Затое ёсьць некалькі сайтаў: «Аголеная Беларусь», «Беларуская прыгажосьць» і «Беларускі клюб аматараў панчохаў», якія можна знайсьці ў пераліку рэсурсаў для дарослых на партале «Дзед Талаш» (dt.home.by). Аўтар «Аголенай Беларусі» хаваецца за псэўданімам «Андрэй Беларэцкі».**

**Працяг на старонцы 15.**



АЛЕНА АДАМЧЫХА

**«Наша Ніва» запрашае** да супрацоўніцтва рэкламныя агенцыі і агентаў па рэкляме на выгадных умовах.
Інфармацыю пра сябе дасылайце на электронны адрас nn@promedia.by.
Т./факс: 284-73-29.



## Родная сястра мінімалкі

**З 1 сакавіка ўрад падвысіць тарыфную стаўку першага разраду ды базавую велічыню. Ня выключана, што апошнюю падымуць у паўтара-два разы. Што нам з гэтага будзе?**

Да 2002 г. нам даводзілася пільна сачыць за зьмяненьнем мінімальнага заробку. Радасьці зь ягонага росту было мала: разнастайныя штрафы ды выплаты, якія ў МЗ вымяраліся, рабіліся больш адчувальнымі. Але дзяржава змушаная была штучна заніжаць мінімалку — інакш мала хто здолеў бы плаціць тыя штрафы. Каб гэтага пазьбегнуць, з 1 сакавіка 2002 г. памеры пэнсіяў, стыпэндыяў, грашовай дапамогі і іншых сацыяльных выплатаў, а таксама падаткаў, збораў, штрафаў, якія раней вылічваліся ў залежнасьці ад мінімальнага заробку, прывязалі да базавай велічыні.

**Працяг на старонцы 6.**

# Нафта і Незалежнасьць

Вайна ў Іраку будзе імклівай і скончыцца перамогай ЗША і саюзьнікаў. Адным з вынікаў падзеньня Хусэйна будзе зьмена коштаў на нафту, якія істотна вызначаюць эканамічную сытуацыю ў сьвеце. На першы погляд, пры ізаляванасьці беларускай эканомікі індэксы біржаў Нью-Ёрку, Лёндану і Токіё ўплываюць на яе ня больш, чым вынікі прэміі «Грэмі» на лёс вясковага гарманіста. Аднак ёсьць адзін фактар, які істотна залежыць ад сусьветных індэксаў. Ён не разглядаецца ў надта сур'ёзна ў Літве, Латвіі, нават ва Ўкраіне. Для лёсу ж беларускай дзяржаўнасьці ён можа быць вызначальным. Гэта — расейская эканоміка.

Падвышэньне цаны нафты на адзін даляр за барэль дае прыбытак у бюджэт Расеі ў 100 млн. даляраў штомесяц. Бюджэт жа на 2003 г. вызначаны з розьніцу 21,5 даляра за барэль. Запомнім гэтыя лічбы.

Цана нафты за барэль на сусьветным рынку ў аўторак 25 лютага дасягнула 36 даляраў. Гэта значыць, расейскі бюджэт дадаткова атрымлівае больш як паўтара мільярда даляраў штомесяц. Гэта — значна больш за штомесячны вайсковы бюджэт Расеі. Расейскія незалежныя экспэрты заўважаюць, што «нафтавыя даляры» ідуць не на мадэрнізацыю вытворчасьці ды стварэньне новых працоўных месцаў, а на ўмацаваньне таго самага войска і спэцслужбаў.

«Нафтавы» прыбытак дазволіў нядаўна Маскве выдаткаваць 30-мільённы крэдыт на падтрымку беларускага рубля («у рамках падрыхтоўкі да аб'яднаньня грашовых сыстэмаў») — самы вялікі маскоўскі крэдыт Менску за апошнія два гады.

З пачаткам вайсковай апэрацыі цана нафты можа дасягнуць 40—45 даляраў. Патэнцыйна гэта дадатковыя інтэграцыйныя праекты. Праблема, аднак, у тым, што зьмяншэньне «нафтавага» даходу Расеі для беларускай незалежнасьці яшчэ больш небясьпечнае.

Пасьля падзеньня Хусэйна цана пачне паступовa зьніжацца. Прычына ня толькі ў выплеску на рынак іракскай нафты, але і ў ліквідацыі «сындрому вайны», які й падкруціў цяперашнія цэны. Некаторыя адмыслоўцы называюць 10 даляраў за барэль, але больш рэальныя выглядаюць 14—15 даляраў. Аптымальная цана для Масквы — 19 даляраў, а падзеньне ніжэй за 16 прывядзе расейскую эканоміку да краху.

Менавіта гэта і мае на ўвазе Масква пад уласным «інтэрасам у Іраку». Магчыма, калі б Крэмль аднaзначна падтрымаў ЗША — яго інтарэсы і былі б улічаны. Пры цяперашняй пазыцыі Расеі рабіць гэта няма асаблівага сэнсу, тым больш што, акрамя міжнародных праблемаў, перад Бушам стаяць і ўнутраныя. У яго, як і ў Пуціна, напярэдадні выбары.

Зьедлівыя камэнтары да падзеньня рэйтынгу Буша ў ЗША — ня больш чым гіпэрбала: рэйтынг сапраўды меншы, чым год таму, але значна большы, чым у Клінтана ў найлепшыя ягоныя часы. І пасьля вайны з Іракам, нават з улікам непазьбежных ахвяраў, ён ня надта зьнізіцца.

Працяг на старонцы 5.

# Таемная місія



Зянон Пазьняк. Новае стагодзьдзе. — Вільня—Варшава, 2002. — 108 с.: іл.

Беларускія палітыкі сёньня амаль ня пішуць кнігаў. Адныя ня маюць часу і ня бачаць патрэбы, іншыя ня ведаюць, што сказаць людзям. Зянон Пазьняк сабраў пад адну вокладку сваю публіцыстыку апошніх двух гадоў. Напісаныя на чужыне артыкулы прысьвечаны самым разнастайным тэмам, але найперш змаганьню за незалежнасьць Беларусі й праблеме духоўнага адраджэньня народу. Сам аўтар мяркуе, што кніга патрэбная найперш тым беларусам, якія «ня мелі магчымасьці атрымаць беларускую адукацыю і карысталіся чужой сыстэмай ведаў». Яна мусіць выканаць асьветную функцыю — расплюшчыць людзям вочы на самыя розныя рэчы. Шкада, што аўтар не прыняў прапановы аднаго зь менскіх выдавецтваў апублікаваць кнігу ў Менску. Выдадзеная за мяжою, яна дойдзе толькі да выбранага кола сяброў партыі, на чале якой стаіць Зянон.

Невясёлую карціну малюе публіцыст З.Пазьняк. Беларусь абкалалі ворагі і з захаду, і з усходу, да таго ж ідзе ціхая ўнутраная акупацыя. Рэжым прадае краіну Расеі, гэтаму ж спрыяе і «здрадніцкая псэўдаапазыцыя». У такой сытуацыі народ мусіць бараніцца, праяўляць нацыянальную салідарнасьць, патрабаваць «новых прэзыдэнцкіх выбараў пад міжнародным пратэктаратам», лічыць Пазьняк. Апошняя прапанова, нягледзячы на яе сёньняшнюю нерэальнасьць, цяпер узятая на ўзбраеньне КХП-БНФ.

Ня лепшая сытуацыя і на Захадзе, якому Пазьняк прадказвае поўную духоўную дэградацыю. Ён піша, што падобны заняпад маралі ў Эўропе адбываўся 500 гадоў назад і тады ў ролі выратавальнікаў цывілізацыі выступіла сьвятая інквізыцыя і езуіты, якія выхоўвалі новую эліту, новага чалавека.

Тэма барацьбы дабра і зла, хрысьціянства і «антыхрысьціянскіх сілаў» праходзіць праз многія тэксты. Зь іх паўстае зусім іншы Пазьняк, Пазьняк-містык, заглыблены ў спасьціжэньне таемнае місіі Беларусі і беларускага народу, у расшыфроўку яго нацыянальнай сымболікі. Ён піша: «Магчыма, што Беларусь і яе народ чакае незвычайная будучыня і сьветлая доля. Магчыма, беларускім прарокам у XXI стагодзьдзі адкрыецца яе сэнс».

Кніга невыпадкова называецца «Новае стагодзьдзе». У ёй абвяшчаецца пра пачатак новага этапу барацьбы за Беларусь. І Пазьняк асьцярожна рыхтуе да гэтага сваіх прыхільнікаў. «Мы мусім абараніць беларускую цывілізацыю», — піша ён. Ды канкрэтызуе, ад каго: ад навалы «хціўасьці, бездухоўнасьці і граху… з Усходу і з Захаду». Беларусь XXI ст. З.Пазьняку бачыцца як «Хрысьціянская краіна». У яе будуць свае рыцары-абаронцы, свае прарокі, але ня будзе ўзаконеная «чалавечая брыдота на падставе фальшыва ўспрынятай лібэральнай канцэпцыі правоў чалавека».

І апошняе. Пазьняк інтрыгуе чытача, калі пад артыкулам «Вялікі Купала» ставіць подпіс: «7 ліпеня 2002 г., Варшава—Менск». Гэта можа сьведчыць ня толькі пра духоўную повязь палітыка-эмігранта з Бацькаўшчынай, але і пра магчымасьць хуткага вяртаньня. У новым стагодзьдзі. З таемнай місіяй.

**Павал Сумарока**

# Скарачэньне насельніцтва – гэта нармальна

**Ужо дзесяць гадоў насельніцтва Беларусі меншае. Памірае людзей болей, чым нараджаецца.**

Разгледзім гэтую зьяву без перадузятасьці. Ці ёсьць пагроза ў тым, што, пры захаваньні цяперашняй дынамікі, насельніцтва Беларусі да канца стагодзьдзя скароціцца ўдвая? Ці залежыць камфорт пражываньня і посьпех нацыі на сусьветнай арэне ад колькасьці яе прадстаўнікоў? Ці могуць даць эфэкт дзяржаўныя захады па рэгуляваньні нараджальнасьці?

Навукоўцы даўно выявілі: чым большая шчыльнасьць насельніцтва на нейкай тэрыторыі, тым ніжэйшая там нараджальнасьць. У многіх буйных гарадах нараджальнасьць ужо ў другім пакаленьні падае настолькі, што не забясьпечвае ўзнаўленьня. Такая сытуацыя назіраецца паўсюдна — ад Нью-Ёрку да Лёндану, ад Варшавы да Масквы. Так было ў старажытным Рыме. Без прытоку людзей звонку насельніцтва мэгаполісу зьмяншалася б удвая цягам жыцьця ўсяго двух пакаленьняў. Горад «усмоктвае» моладзь з высокай патэнцыйнай нараджальнасьцю і моцна зьмяншае яе (0,7 дачкі на маці).

Працяг на старонцы 14.

• ШТО ПІШУЦЬ •

## «Дай сьпісаць!»

**Мясцовыя выбары ідуць да свайго завяршэньня, у чарговы раз ня стаўшы школай дэмакратыі.** У раёнах, дзе наагул няма альтэрнатыўных акруг, кандыдаты ад улады ня маюць патрэбы ў агітацыйнай кампаніі. Іншае становішча ў альтэрнатыўных акругах — на Гарадоччыне іх пяць. Як толькі зьявіліся ў акрузе матэрыялы кандыдата Леаніда Гаравога, актывіста незарэгістраванай АСДП, адразу ж старшыня раённай камісіі У.Зыкаў прапанаваў кандыдатам ад улады напісаць перадвыбарчыя праграмы. А раённая камісія іх надрукуе ў Віцебску. Цікавай была рэакцыя кандыдатаў: «Ты напісаў праграму?» — «Не». — «Напішаш — дай сьпісаць».

Чыноўнікі райвыканкаму амаль штодзённа апрацоўваюць сьвядомасьць выбаршчыкаў пад шыльдай інфармацыйных сустрэч. Рэдактар райгазэты атрымаў указаньне не друкаваць матэрыялаў альтэрнатыўных кандыдатаў, калі ня будзе матэрыялаў ад уладных. Таму і ідуць выбаршчыкі на галасаваньне ў інфармацыйным вакууме.

**Міхась Лагор, Гарадок**

ДРУКУЕЦЦА ЯК СПРЭЧНЫ

# Небясьпечны дух



На пачатку кастрычніка 1919 г. прэм'ер-міністар БНР Антон Луцкевіч казаў карэспандэнту часопісу «Беларускае Жыцьцё»: «Мы сустрэліся з фактам устанаўленьня «сфэр уплываў» вялікіх дзяржаў на колішніх расейскіх землях. Паводле гэтага разьдзелу Літва, Латвія і Эстонія апынуліся ў межах англіцкага ўплыву, а Беларусь разам з Польшчай і Ўкраінай — у межах францускага. Лічу патрэбным адзначыць тут асабліва гэты факт: ён можа мець сур'ёзныя пасьледзтвы для Беларусі ў будучыні».

Луцкевіч не памыліўся. У 1939 г. ён успамінаў: «Праз пэўны час мне паведамілі, што Клемансо паставіўся да праекту польска-беларускае фэдэрацыі рэзка адмоўна. «Там будзе Расея!» — сказаў ён, стукнуўшы кулаком па мапе, дзе абазначалася Беларусь».

Гэтыя словы ад Клемансо пачуў польскі міністар-прэзыдэнт Ігнацы Падарэўскі, якога неўзабаве эндэкі й Пілсудзкі «зьелі». Уступіць у фэдэратыўныя адносіны зь Беларусяй палякам раіла брытанская дэлегацыя на мірнай канфэрэнцыі ў Парыжы, але на дарозе гэтага праекту стаў сп'янелы ад вялікадзяржаўнасьці Клемансо.

Напалеон аддаў цару Падляшша. Клемансо аддаваў Расеі ледзь ня ўсю Беларусь. Клемансо стукнуў кулаком па мапе. Жак Шырак праз 83 гады гаркнуў, як сэржант, на цэнтральнаэўрапейскія дзяржавы, што выказалі салідарнасьць з Амэрыкай у яе антысадамаўскіх намерах...

Раней ці пазьней, але сапраўдны твар вялікадзяржаўніка выходзіць з-пад грыму вонкі.

Цікава назіраць, як францускі вялікадзяржаўнік дзьме ў адну дуду зь немцам. У мяне няма аніякіх сумневаў, што ў Нямеччыне адраджаецца шавінізм. І не зьдзіўляе тое, што нямецкі вялікадзяржаўны дух распальвае сацыял-дэмакрат. Шродэру трэба неяк адцягнуць увагу ад вострых эканамічных праблемаў. Падругое, эсдэкам даўно прышпільваюць «недастатковы патрыятызм». Вось яны й стараюцца...

Думаю, што Шродэр марна выдыгаецца. СДПН даўно паказала сваю «нямецкасьць», асабліва ж непрыхільнасьць да беларускае дэмакратыі. У 1918—1920 г. сацыял-дэмакратычны ўрад Нямеччыны, як і кайзэраўскі перад гэтым, не схацеў прызнаваць дэ-юрэ БНР з эсдэкамі на чале. А вось БССР, якую стварыў бальшавіцкі Крэмль, прызнаў.

Мне было цікава назіраць, як сучасныя немцы, што атрымалі дэмакратыю ад ЗША і Брытаніі, выступаюць у нашай краіне ў якасьці настаўнікаў дэмакратыі. Кідалася ў вочы, што СДПН практычна ніяк не спрыяе разгортваньню сацыял-дэмакратычнага руху ў Беларусі, нічога ня робіць дзеля палітычнае асьветы нэафітаў, асабліва ўчорашніх камуністаў.

Момант ісьціны настаў у 2000 г. Немец, які доўга жыў у Беларусі, сказаў мне пра палітыкаў-суродзічаў: «Раскалолі вашу дэмакратыю і вашу партыю. Вашым гнуткім эсдэкам паабяцалі ганарары за ўдзел у выбарах у «палату». Пасьлы Вік і Вінкельман угаварвалі адміністрацыю, каб за прызнаньне квазіпарлямэнту дала два-тры мандаты эсдэкам». — «Я здагадваўся. А што будзе далей?» — «Усё адно прызнаюць. Яны глядзяць на Расею».

Немцы з Расеяй і Францыяй хочуць панаваць у Эўропе. «Рускаму духу» даспадобы, што Расею зноў называюць вялікаю дзяржаваю, «нямецкаму духу» — што на чале Расеі зноў стаіць чалавек, які размаўляе па-нямецку. Бэрлінскія палітыкі спадзяюцца, што зь «немцам» у Крамлі лёгка будзе дамаўляцца. Таму, як і на пачатку 1920-х, яны прызнаюць той парадак у Беларусі, які прызнаў Крэмль. А «гальскі дух» заўсёды рады здаць кагосьці Расеі. Або — як Чэхаславаччыну (1938) і Польшчу (1939) — немцам.

**Анатоль Сідарэвіч**

# Маладэчна: намэнклятура агітуе па-беларуску, БНФ — па-расейску

Дэмакратычная апазыцыя ў Маладэчне вылучыла ў гарсавет шасьцёх кандыдатаў. Зарэгістравалі трох: Алеся Капуцкага ды Івана Лагвіновіча з БНФ і былога сябра КХП-БНФ Эдуарда Баланчука.




Апошні балятуецца яшчэ й у абласавет. Увогуле ж на 31 дэпутацкае месца прэтэндуюць 50 кандыдатаў. У 15 акругах выбары безальтэрнатыўныя.

Партыйных структураў амаль не чуваць. У горадзе існуюць і дзейнічаюць толькі БНФ і КПБ. Гэта засьведчылі і выбары. Сярод кандыдатаў — два сябры БНФ, сябра КПБ і другі сакратар лукамольскага БРСМ. Большасьць кандыдатаў маглі б утварыць такі сабе «блёк беспартыйных настаўнікаў і дактароў»: сярод іх 14 пэдагогаў і 12 мэдыкаў.

У вёсках альтэрнатывы няма зусім. Выбарамі ў райсавет, як кажа кіраўнік Цэнтру грамадзкіх ініцыятываў Алесь Капуцкі, дэмакраты нават не цікавіліся. У Радашкавічах і то няма ніводнага дэмакратычнага кандыдата. «Людзі ў паняверцы, — тлумачыць сп. Капуцкі. — Бо лічаць, што выбары ўсё адно сфальсыфікуюць, і ня бачаць рэальнай улады ў мясцовых саветаў».

Маладэчанскія дэмакраты скардзяцца і на ціск уладаў. Новы мэр Чурсін пільна дбае пра «слушнае» галасаваньне, а на вуліцы немагчыма ўзьняць нацыянальны сьцяг. Прэтэнзіяў да міліцыі ў маладачанскіх нацыяналістаў няма, але яна сама знаходзіцца пад наглядам КДБ.

Ня толькі рэпрэсіі ніштожаць беларускі дух. Самі прадстаўнікі дэмакратычнага руху прыкладаюць да гэтага руку. Адметнасьць гэтых выбараў: кандыдаты ад БНФ, акрамя Баланчука, павыдавалі расейскамоўныя ўлёткі. Намэнклятурнікі ж, у тым ліку адыёзная Данілея Жук, склалі свае звароты да выбарцаў на роднай мове.

Гэта не бянтэжыць апазыцыі. Іван Лагвіновіч кажа, што падчас збору подпісаў выбарцаў пужала ягоная партыйная прыналежнасьць. І таму «лепш будзе, калі я стану дэпутатам, а не калі 2000 выбарцаў прачытаюць маю ўлётку па-беларуску. Трэба прыйсьці да ўлады, а тады ўжо будзем займацца адраджэньнем Бацькаўшчыны». Нейкая кульгавая лёгіка. У Маладэчне ўсе разумеюць па-беларуску, газэты рэгіёну выходзяць па-беларуску. Напішы простыя, важныя рэчы — і цябе яшчэ пахваляць, што ты на роднай мове зьвяртаешся. А вось расейскае «навамоўе» Іванавай улёткі — зборку канцылярскіх шаблёнаў — успрымаць цяжка.

Ня лепшыя й улёткі іншых маладачанскіх кандыдатаў. Пытаюся, чаму такія шэрыя й невыразныя агітматэрыялы зрабілі. Адказваюць: «Дык жа за дзьве гадзіны давялося пісаць. Зь Менску даслалі «рыбу» макету, мы паставілі свой хуценька напісаны тэкст і мусілі тэрмінова везьці ў друкарню». От сюрпрыз — выбары! Вясна для кандыдатаў «пачалася, як заўжды, зьнянацку». Такія ў нас выбары і такі ў нас цяпер БНФ.

**Сяргей Прытыцкі, Маладэчна**

ГЛЫБОКАЕ

# Амаль безальтэрнатыўна

Глыбоччына мусіць абраць двух дэпутатаў у Віцебскі абласавет. Толькі ў адной акрузе выбарцы маюць альтэрнатыву: там спаборнічаюць сябра БСДП (НГ) Зьміцер Курцэвіч і работнік аблвыканкаму. Ня лепшая сытуацыя і па выбарах у раённы савет. На 38 месцаў тут зарэгістравана 40 кандыдатаў. Пра сельскія і пасялковыя саветы зусім няма гаворкі: тут на 150 месцаў прэтэндуе 151 кандыдат. Аналягічны стан і ў суседніх раёнах. У Докшыцкім, напрыклад, зусім няма альтэрнатыўных кандыдатаў.

Большасьць насельніцтва расчараваная прадстаўнічай уладай, мала хто верыць, што дэпутат можа зьмяніць становішча да лепшага. Як даверанай асоба кандыдата ў абласавет, я праехаў некалькі вёсак ягонай акругі. Людзі ў большасьці ведаюць, хто ад іх абіраецца ў вобласьць і раён, але пра кандыдатаў у свой сельсавет амаль ніхто ня чуў. У вёсцы няма альтэрнатывы — выбары ўсё роўна адбудуцца, таму ніхто з кандыдатаў не імкнецца ладзіць нейкую агітацыю.

У Глыбоцкі райсавет ад дзьвюх партыяў — БНФ і БСДП (НГ) — было вылучана толькі пяць чалавек. Траім зь іх у рэгістрацыі адмовілі. У райсавет ад БНФ абіраецца Ўладзімер Скрабатун, рэдактар газэты «Вольнае Глыбокае», аўтар «НН». Ягоны супернік — дырэктар глыбоцкай беларускай школы Віталь Гарановіч. «Я б і сам за яго галасаваў», — кажа У.Скрабатун. Ад Народнай Грамады ў райсавет ідзе Зьміцер Курцэвіч — той самы, які вылучаецца ў абласны савет.

Яраслава Берніковіча (БНФ) не пусьцілі ў кандыдаты, бо прапісаны па адным адрасе, а пражывае па іншым. Калі ж ён падаў скаргу, абласная камісія апраўдала яго, але ж знайшла зачэпку ў іншым — няправільна складзеная дамова з выдаўцом газэты, супрацоўнікам якой Берніковіч зьяўляецца.

Другому кандыдату, Зьмітру Лупачу (Народная Грамада), было адмоўлена на падставе таго, што ён нібыта хаваў свае прыбыткі. Чалавек прадаў малапрадукцыйную карову і адразу ж купіў іншую, заплаціўшы болей грошай. Але «прыбытку» ад продажу не задэкляраваў. Вось і прычапілася камісія. На заўвагу Лупача, што выручка і прыбытак — розныя рэчы, адна зь сяброў камісіі заявіла: «Вы маглі працаваць стратна, але ж вы атрымалі прыбытак»...

З аналягічнай прычыны не прайшла і Юлія Бука (Народная Грамада): яна прадала бычка, а грошай у дэкларацыю не запісала. Камісія не паглядзела нават на тое, што гэтая кабета выхоўвае траіх дзяцей, нічога ня просячы ў дзяржавы.

**З.Л., Глыбокае**



**Нацыянальны рух на выбарах у Глыбокім прадстаўляе Уладзімер Скрабатун.**

БАРЫСАЎ

# Выбары для дырэктараў



**Сяржук Салаш змагаўся да апошняга, але суд паверыў таму, што было надрукавана ў нямых паперах, не прыняўшы да ўвагі жывыя словы сьведкаў.**

У Барысаве з 46 прэтэндэнтаў кандыдатамі сталі толькі 36. А выбарчых акругаў у Барысаве 26. У 17 зь іх зарэгістравана па адным кандыдаце.

З 36 кандыдатаў 19 — дырэктары і намесьнікі дырэктараў дзяржпрадпрыемстваў, арганізацый, школаў. Пасьля выбараў у гарсавеце, як было ўжо многа гадоў запар, створыцца такая сабе «малая рада дырэктараў». Яшчэ пяцёра прэтэндэнтаў — вайскоўцы й міліцыянты.

З 33 раённых акругаў толькі ў адной (!) зарэгістраваныя два кандыдаты. У астатніх — усё тыя ж дырэктары. Хочаш — выбірай, ня хочаш — усё роўна выбірай. У вёсцы звычайна калі выбаршчыкі ня йдуць да урны, урна йдзе да іх.

Ніводзін прэтэндэнт ад кааліцыі «Дэмакратычны Барысаў», што ішоў на выбары шляхам збору подпісаў, у сьпісы кандыдатаў ня трапіў. Большасьці зь іх гарадзкая выбарчая камісія адмовіла з дробных фармальных прычын. Зарэгістраваныя толькі кандыдаты, якія балятаваліся ад палітычных партыяў. З шаснаццаці сяброў «Дэмакратычнага Барысава» ў выбарчай гонцы ўдзельнічаюць чатыры барысаўскія партыйцы — «агэпоўцы» Віктар Гарбачоў, Ігар Леднік, Леў Марголін ды Мікалай Пахабаў ад Беларускай партыі працы.

Падчас рэгістрацыі зьнялі з дыстанцыі й незалежных прэтэндэнтаў, якія не належаць да апазыцыйных партыяў, але «засьвяціліся» грамадзкай дзейнасьцю і апазыцыйнымі поглядамі. Сержуку Салашу, лідэру незарэгістраванага моладзевага аб'яднаньня «Скрыжаваньне», і яго паплечніку Зьмітру Бабіцкаму гарвыбаркам адмовіў у рэгістрацыі: дата подпісаў у падпісных лістах у шасьці выпадках з 91 пастаўленая выбаршчыкамі «неўласнаручна». У наступныя два дні Салаш абабег амаль усе каватэры ў сваёй акрузе (вайсковым гарадку Печы) і атрымаў ад выбаршчыкаў 89 расьпісак, у якіх тыя пацьвердзілі, што подпіс і дату ставілі сваёй рукой.

5 лютага адбыўся суд. Старшынька гарвыбаркаму аддала судзьдзі дакументы, падпісаныя выбаршчыкамі, дзе сьцьвярджалася, што дату ў падпісных лістах ставіў сябар ініцыятыўнай групы. Барысаўскі суд перадаў справу Салаша ў Менск. Там, у абласным судзе, усплылі тыя самыя паперы, але з крыху даўжэйшым тэкстам. Было дадрукавана «ўсяго толькі» тое, што сябар ініцыятыўнай групы ставіў ня толькі дату, але й подпіс.

Падлог абурыў печынцаў. Акрамя таго, судзьдзя дазваляла сабе на адрас сьведкаў абразы й крыўдныя эпітэты. Лёс Салаша быў вызначаны.

Працяг на старонцы 4.

# Быкаў у сэрыі «Расейская проза»

**Дзясяты Менскі міжнародны кніжны кірмаш ды Кніжная выстава-кірмаш адкрыліся 25 лютага ў Выстаўным цэнтры «БелЭкспа». Беларускамоўных кніжак там відавочна бракавала.**



IREX-PROMEDIA

Статыстыка сьведчыць, што летась у краіне было выдадзена 7753 найменьні кніжак і брашураў агульным накладам 44,25 млн. асобнікаў. (Зь іх па-беларуску 752 выданьні — 4,23 млн. экзэмпляраў.) Пры гэтым дзяржаўныя выдавецтвы выпусцілі ўсяго 569 найменьняў накладам 7 млн. асобнікаў (адпаведна, на 23% і 31,2% менш, чым у 2001 г.). Доля беларускамоўных выданьняў трымаецца апошнія гады нязьменнай — каля 10% ад агульнага накладу.

Віцэ-міністар інфармацыі Станіслаў Нічыпаровіч тлумачыць гэта тым, што айчынныя паліграфісты і кнігараспаўсюднікі абкладзеныя вышэйшымі падаткамі, чым расейскія. Гэта выклікае паступовае зьмяншэньне абʼёму выпуску кніг у Беларусі. Праўда, калі С.Нічыпаровіч кажа, што «ў кожнай кнігарні ёсьць поўны асартымэнт беларускамоўнай літаратуры», ён або выдае жаданае за рэальнае, або не бывае далей за сваю ведамасную кнігарню «Сьветач». Нават у Горадні «поўны асартымэнт» абмяжоўваецца дзясяткам кніг дзяржаўных выдавецтваў. Пра райцэнтры годзе й казаць.

Парадавалі стэнды прыватных выдавецтваў: «Кавалер» — з шыкоўна аформленымі дзіцячымі кнігамі пабеларуску, «Тэхналёгія» — з гуманітарнымі навінкамі. Асаблівы гонар выдавецтва — кніга Ўінтэра і Бэлоўза «Канфлікт і кампраміс. Уводзіны ў палітычную навуку». Аднак наведнікі цікавіліся збольшага краязнаўчай ды гістарычнай літаратурай.

«Беларускі кнігазбор» удзелу ў выставе ня браў. Як патлумачыў выканаўчы дырэктар Г.Вінярскі, іхная распаўсюдніцкая сетка адладжаная і новых рынкаў збыту ў Беларусі «Кнігазбор» папросту ня бачыць.

Украінская сэкцыя глядзелася на зайздрасьць прадстаўніча. «Місія Бандэры», «Гісторыя Турэччыны», «Эканоміка», «Казкі Эўропы» — багацьце назваў пры шыкоўнай паліграфіі. 26 лютага ў «Сьветачы» адкрыўся аддзел украінскай кнігі. Прадстаўнік выдавецтва «Камяняр» жахаецца: «Мы зайшлі ў тутэйшыя кнігарні і схапіліся за галаву — усё завалена расейскамоўнай прадукцыяй. Менавіта прадукцыяй, бо цяжка назваць тыя выданьні яшчэ як-небудзь. На дзьве трэціны гэта містыка, эзатэрыка і падобнае».

Дый на выставе ад расейскамоўнай літаратуры ўгіналіся сталы. Самы цымус — дзьве новыя кнігі прозы Васіля Быкава, выдавецтваў «Эксмо» і «Вагрыюс». «Эксмо» апублікавала зборнік твораў В.Быкава ў сэрыі «Чырвоная кніга расейскай прозы». Мы зьвязаліся зь пісьменьнікам. «Ніякай дамовы з «Эксмо» я не падпісваў!» — заявіў ён. Самае цікавае, што да «стварэньня» кнігі прыклалі руку беларускія літаратары. На інтэрнэт-сайце litara.net яны паведамляюць свае імёны.

**Адам Воршыч, Мікола Бугай**

## ТЫДЗЕНЬ НАШАГА ЖЫЦЬЦЯ

### Адпачынак па-прэзыдэнцку

**Свой адпачынак Аляксандар Лукашэнка бавіць у Сочы — на гарналыжным курорце.** Ён спыніўся ў катэджы «люкс» шыкоўнага гатэльнага комплексу «Рэдысан САС Лазурная Пік Гатэль», пішуць «Известия». Кожныя суткі пражываньня ў прэзыдэнцкай віле каштуюць 890 даляраў, дадае радыё «Свабода». Мяркуецца, што прэзыдэнт прабудзе там да 10 сакавіка. Пакуль невядома, якім чынам ён зможа ўзяць удзел у мясцовых выбарах.

### Івашкевіч перамог на выбарах

**У папраўчай установе адкрытага тыпу пры Баранавіцкім РУУС прайшлі выбары ў раду атраду.** У выніку гэтых безальтэрнатыўных выбараў аднагалосна, пры стоадсоткавым удзеле выбарцаў старшынём рады, а значыць кіраўніком тамтэйшага самакіраваньня быў абраны намесьнік старшыні БНФ Віктар Івашкевіч.

### АНТ: новы кіраўнік, параза

**Гэнэральным дырэктарам АНТ зрабіўся Юры Казіятка, які зьмяніў Андрэя Астравуха, што вярнуўся ў тэлекампанію «ФІТ».**

Тым часам Гаспадарчы суд абавязаў праграму АНТ «Контуры» абвергнуць як цалкам неадпаведную рэчаіснасьці інфармацыю пра тое, што віцебскае замежнае прадпрыемства «Вітэла» ўвозіць у краіну тэрмінаваную сыравіну, набытую на эўрапейскіх сьметніках, а шакаляд робіць з падвышаным утрыманьнем цынку. Заснавальнік «Вітэлы» — нямецкі канцэрн «Schwartau» — задаволены рашэньнем.

### Мытні не абуеш

**Супрацоўнікі Віцебскай мытні канфіскавалі 7619 пар італьянскага абутку на суму 1.091.540.000 рублёў.** Тавар везьлі ў Расею па падробных дакумэнтах — фірма-атрымальніца была зарэгістраваная на падстаўную асобу.

### Памяць пра Мулявіна

**Жыхары вул. Леаніда Бяды (героя вайны) прапанавалі, каб іх вуліцы надалі імя Мулявіна.** Ён жыў у гэтым квартале. Плянуецца стварыць музэй песьняра, паставіць яму помнік і ўсталяваць мэмарыяльную дошку.

### Леванеўскі супраць «Биржи информации»

Лідэр незарэгістраванага страйкаму прадпрымальнікаў Валеры Леванеўскі падаў у суд на газэту «Биржа информации». У публікацыі пра сход прадпрымальнікаў яго абразіў сказ: «Лідэр стачкаму быў ганебна прагнаны з плошчы». Леванеўскі цьвердзіць, што пакінуў пляц з уласнай волі. Аўтарка матэрыялу ў адказ прадэманстравала гуказапіс. На ім добра чуваць, як, перапыняючы Леванеўскага, людзі скандуюць «Сыходзь!» і «Надакучыў!»

**НН; паводле БелаПАН, радыё «Свабода», gazeta.ru, gazeta.pl**

# Выбары для дырэктараў

Працяг са старонкі 3.

Сяржук Салаш змагаўся да апошняга, але суд паверыў паперам барысаўскай камісіі, не прыняўшы да ўвагі паказаньняў сьведкаў.

Той самы шлях прайшоў і Зьміцер Бабіцкі. Наагул, ніводная судовая справа не завершылася перамогай прэтэндэнта.

Не прыпыняецца ціск на дэмакратычных кандыдатаў падчас агітацыйнай кампаніі. Незалежныя кандыдаты Пахабаў, Чыстоў і Марголін атрымалі па папярэджаньні.

Кандыдаты, што абыходзілі кватэры, кажуць, што барысаўцы гатовыя галасаваць за новых людзей, бо «абрыдла ўжо быць быдлам для ўладаў». Каб мясцовая ўлада займела рэальную сілу, трэба зьмяніць заканадаўства аб самакіраваньні. А ініцыятарамі такіх зьменаў могуць быць толькі незалежныя дэмакратычныя дэпутаты.

**Алена Аўтушка, Барысаў**

## З УСЁЙ КРАІНЫ

### Новае гарадзенскае піва

**На Гарадзенскім бровары пачалі варыць новае сьветлае піва «Залатое зярнятка».** Яно мае характэрны пах і ўтрымлівае 4,5% алькаголю.

### Кандыдаты ў абарону газэты

**Чатыры кандыдаты ў дэпутаты Смургонскага райсавету (В.Батурын, А.Маціяка, І.Вештарт, Н.Калбыка) зьвярнуліся да старшыні райвыканкаму** Станіслава Юргеля з зваротам у абарону «Новой газеты Сморгони», якой пагражае закрыцьцё.

### Рынак пабудуюць прадпрымальнікі

**Гарадзенскі рынак «Паўднёвы» у 2003 г. будзе перавезены пад дах.** Мэталічныя боксы паўстануць «за кошт прыцягненьня сродкаў прадпрымальнікаў».

**Андрэй Мялешка, Горадня**

### Дзевяціклясьнік падаўся ў рабаўнікі

**На ўскрайку Мядзелу ўвечары на кабету напаў чалавек у масцы.** Пагражаючы шылам, ён патрабаваў грошы. Але разжыцца не ўдалося: рабаўніка спудзілі мінакі і ён зьбег. Кабета адразу патэлефанавала ў міліцыю. Па апісаньні няўдачлівага рабаўніка хутка затрымалі на вуліцы. Дзіўна, што ім аказаўся дзевяціклясьнік.

**Алесь Высоцкі, Мядзел**

### Pahrozu vykanaŭ

**Biespracoŭny žychar Baranavič padpaliŭ svaju chatu pa vulicy Ščorsa, a paśla sam u joj zasiliŭsia. Pažarnyja vyciahnuli jaho ŭžo niežyvoha.** Žonka śćviardžaje, što za kolki dzion da zdareńnia toj hraziŭsia hetak zrabić. Ciapier harotnaj žančynie treba i mužyka pachavać, i žyllo znajści. Rečaŭ taksama amal nie zastałosia.

### Dapadrablaŭsia

**U Baranavičach pravaachoŭnyja orhany kanfiskavali 7,5 ton śpirtu.** U hety ž čas u horadzie byŭ schopleny i aryštavany kiraŭnik złactziejskaj hrupy, jakaja padrablała harełku i zdoleła lehalizavać praz bank kala 100 mln. rubloŭ. Heta byŭ staršyna milicyji. Za jim daŭno sačyli, bo padazravali ŭ pieraprodažy kalarovych metałaŭ.

### KChP pahražaje kandydatam sudom

**Viktar Miaziak, kandydat u deputaty harsavietu ad BNF, atrymaŭ dva listy-pahrozy.** Pieršy — «List da kiraŭnikoŭ i siabroŭ partyj, jakija ŭdzielničajuć u vybarach», pryniaty sojmam KChP-BNF. Druhi — biuleteń Biełaruskaha kamitetu abarony (BKA) «Volnaja Biełaruś» z zvarotam Zianona Paźniaka da staršyniaŭ i siabroŭ vybarčych kamisijaŭ. U adozvach napisana, što, bieručy ŭdzieł u vybarach, ludzi pradajuć Radzimu, dapamahajuć dałučyć Biełaruś da Rasiei. Im prapanujecca admovicca ad udziełu ŭ vybarach. Inakš paślia prychodu da ŭłady demakratyčnych siłaŭ atrymajuć ad 7 da 15 hadoŭ turmy za dziaržaŭnuju zdradu.

**Rusłan Raviaka, Baranavičy**

### Дакальяніўся

**Да трох гадоў пазбаўленьня волі засуджаны кантрактнік з Жодзіна за захоўваньне й ужываньне марыхуаны ў казарме адной з вайсковых часьцей Барысава.** Сяржант набываў цыгарэты з марыхуанай на барысаўскім рынку і курыў з дапамогай самаробнага кальяну. Пасьля байцу надакучыла «лавіць кайф» у адзіноце і ён запрасіў свайго саслужбоўца, пасьля — другога, прычым за вызначаную плату. Сяржант тлумачыў свой учынак тым, што надаўна кінуў піць, а трэ былі новыя вострыя адчуваньні.

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца**

### Судмэдэкспэрт-хабарнік

**За спробу вымагальніцтва з выкарыстаньнем службовага становішча затрыманы загадчык аддзяленьня Аршанскай міжраённай судмэдэкспэртызы.** На яго скардзіўся жыхар вёскі Высокае Аршанскага раёну. Судмэдэкспэрт патрабаваў ад яго 200 даляраў за заключэньне аб прычынах сьмерці маці. Яна памірала ў сына на вачох, і той не ратаваў як мог. Сын спужаўся, што, магчыма, ён гэтым больш нашкодзіў, чым садзейнічаў выратаваньню. Экспэрт выкарыстаў гэтыя сумневы. Разгублены мужчына нават быў гатовы даць хабар, але сума ў 200 даляраў была для яго непасільнай. Таму чалавек і пайшоў да праваахоўнікаў.

**Віктар Лютынскі, Орша**

### Малыя крадуць у старых

**У міліцыю Воршы зьвярнуўся пэнсіянэр, у якога зладзеі скралі з павеці каляску з двума мяхамі бульбы.** Як высьветлілася, крадзеж зьдзейсьнілі навучэнец ПТВ і вучань 6 клясы. Супраць малалетніх зладзеяў узбуджана крымінальная справа. Амаль у той жа час пацярпела і адна пэнсіянэрка. У яе скралі з склепу харчоў на 24 тыс. рублёў. У злачынстве падазраецца вучань 7 клясы, які, даведаўшыся аб тым, што яго шукае міліцыя, некуды зьнік.

**Віктар Лютынскі, Ворша**

# Нафта і Незалежнасьць

Працяг са старонкі 2.

Амэрыканцы высока ставяць свабоду, яны гатовыя ахвяраваць жыцьцём за дэмакратыю, і гісторыя Амэрыкі гэта неаднаразова пацьверджала. Але, акрамя палітычнага і гуманітарнага, Буш павінен будзе паказаць і нейкі эканамічны вынік.

На пачатак выбарчай кампаніі прыпадуць выдаткі на аднаўленьне ірацкай эканомікі — да 60 млрд. даляраў. Гэта не крытычныя грошы для ЗША, але яны маглі б пакрыць частку сацыяльных праграмаў, вакол якіх звычайна і спрачаюцца кандыдаты ў прэзыдэнты. А вось што ніколі ў ЗША не было прадметам выбарчых дэбатаў — дык гэта нізкая, у параўнаньні з эўрапейскай, цана на бэнзін. У 1996-м даходзіла да 25 цэнтаў за літар. Рост пачаўся два гады таму, і цяпер літар каштуе 50 цэнтаў. Зразумела, што азначае гэта для амэрыканцаў, палова жыцьця якіх праходзіць на колах. Аўто для кожнага, хто працуе, — неабходнасьць.

А ўявіце, што цана зноў упадзе да 25 цэнтаў. Вось прычына, зь якой Вашынгтон ня будзе надта стрымліваць падзеньне цаны на нафту.

Вернемся да Расеі, бюджэт якой на траціну складаецца з экспарту нафты. Зьніжэньне цэнаў нават да закладзенага ў бюджэце паказьніка ў 21,5 даляра за барэль прывядзе да страты сумы, у паўтара разу большай за вайсковы бюджэт. А падзеньне будзе большым. Меркаваць, што страты кампэнсуюць скарачэньнем выдаткаў на войскі і спэцслужбы, — наіўна. (Гэта як у анэкдоце, калі сын кажа бацьку-алькаголіку: «Тата, табе зьменшылі заробак і цяпер ты будзеш менш піць?» — «Не, сынок, гэта ты цяпер будзеш менш есьці».)

Ня варта ацэньваць якасьць жыцьця Расеі па Маскве: 30% расейцаў існуюць на мяжы беднасьці. Ёсьць рэгіёны, дзе заробкаў ня плацяць месяцамі. Камунальныя драмы з марозам у кватэрах ведаюць усе.

У сытуацыі эканамічнага спаду, сацыяльнай напружанасьці, паразы ў Чачэніі й давядзецца Пуціну весьці выбарчую кампанію. Несумненна, што Крэмль перавядзе ўвагу электарату ў рэчышча ідэалягічнае, сыграе на традыцыйным імпэрскім комплексе.



Украіна пацьвердзіла і на ўзроўні ўлады, і на ўзроўні апазыцыі імкненьне да Эўразьвязу і NATO. Пра NATO заявіла Грузія. У іншы ад Масквы бок ідуць і большасьць былых рэспублік СНД. Нават ляяльныя да Масквы Армэнія і Малдова не гавораць пра «саюзную дзяржаву».

Далучэньне Беларусі — вось што можа дапамагчы Пуціну. Ня будзем абсалютызаваць «беларускі аспэкт» у ягонай PR-кампаніі, але і ня ўлічваць яго было б памылкай.

Перашкодзіць Крамлю мог бы Захад. Менавіта прыхільнікі ўдару па Хусэйну — Злучаныя Штаты і Вялікабрытанія — выступілі на пачатку 1990-х гарантам незалежнасьці Беларусі. Пасьля вайны пазыцыя гэтых краінаў узмоцніцца.

Цяпер заходнія назіральнікі бачаць два падыходы ў беларускай апазыцыі. Адзін — «У Эўропу разам з Расеяй». Ці як пісаў карэспандэнт «Народнай волі» А.Сіліч пра адну канфэрэнцыю: «Усе без выключэньня ўдзельнікі дыскусіяў зь Беларусі не забываліся паўтараць пра сваю прыхільнасьць ідэям саюзу Беларусі і Расеі альбо замоўчвалі гэтае балючае пытаньне. І ніхто аніразу нават ня вымавіў такіх слоў, як «незалежнасьць і сувэрэнітэт Беларусі» («НВ», 15 лістапада 2002 г.). Але з другога боку — былі і тыя, хто пікетаваў тую самую канфэрэнцыю.

У кожным разе, толькі ад прыхільнікаў беларускай дзяржаўнасьці будзе залежаць, у якой ступені ўдасца пераканаць Захад у сваіх прыярытэтах.

**Сяргей Навумчык, Прага**

## Скандалы ў Расеі

**Азэрбайджанскі суд даў 10—11 гадоў пазбаўленьня волі тром расейскім шпіёнам, якія працавалі на вайсковую выведку.** Другі скандал — крымінальны. Падчас аднаго з самітаў СНД у Сочы прэзыдэнты езьдзілі скрадзеным аўтобусам. Нямецкі MAN быў вывезены зь Берасьця ў расейскі Варонеж і зарэгістраваны там па фальшывых дакумэнтах. Фірма з Варонежу прадала яго расейскаму Міністэрству шляхоў зносін, а тое — сочынскай санаторыі, дзе адбывалася сустрэча. У часе сьледзтва высьветлілася, што й фірма тая была несапраўдная.

## Басаеў у чорным сьпісе

**Урад ЗША ўнёс у чорны сьпіс міжнародных тэрарыстычных арганізацый тры чачэнскія групоўкі:** «Батальён камікадзэ-шахідаў», «Аб'яднаныя сілы каўкаскіх маджагедаў» ды «Кангрэс народаў Ічкерыі й Дагестану». Усе яны створаныя Шамілем Басаевым як апазыцыйныя Аслану Масхадаву дзеля ажыцьцяўленьня на Каўказе мусульманскай рэвалюцыі. Сам Басаеў на тым тыдні ўзяў на сябе адказнасьць за сьнежаньскі тэракт каля сядзібы прамаскоўскага ўраду ў Грозным.

## Татаркі патрабуюць паранджу

**Вярхоўны суд Расеі будзе разглядаць скаргу трох татарак зь Ніжнякамску** (Татарстан), якія патрабуюць, каб і на пашпарт іх фатаграфавалі ў хіджабах (татарскіх хустках). Суды Татарстану ім у такой просьбе адмовілі.

## Украіна—Польшча

**«Просім прабачэньня ў палякаў, лёс якіх зламала ўкраінская зброя, а прconfigurations праз іх — ва ўсяго грамадзтва», — гаворыцца ў лісьце ўкраінскіх інтэлектуалаў.** Вядзецца пра падзеі на Валыні ў 1943—44 г., калі ўкраінскія партызаны-нацыяналісты забілі некалькі дзясяткаў тысяч палякаў. «Прымусовае выштурхоўваньне валынскіх палякаў было трагічнай памылкай», — гаворыцца ў дакумэнце, падпісаным пісьменьнікам Юр'ем Андруховічам, гісторыкам Яраславам Грыцакам ды інш.

**Франц Субель**

# Парку Дракулы ня будзе

**Цэрквы Румыніі ўхвалілі рашэньне ўраду аб адмене будаўніцтва «Парку Дракулы». Улада матывуе адмову ад праекту эканамічнай нявыгадай, царква — маральнымі праблемамі.**



«Мы ня супраць будаўніцтва тэматычнага парку, які б садзейнічаў эканамічнаму разьвіцьцю той ці іншай мясцовасьці, — заявіў прэс-сакратар Румынскага патрыярхату Косьцел Стойка. — Але мы супраць таго, каб гэты парк называўся імем літаратурнага героя, які ня мае нічога супольнага ні з гісторыяй, ні з культурай, ні з духоўнымі традыцыямі Румыніі».

Паводле Стойкі, «літаратурны міт» пра графа Дракулу, створаны ірляндзкім пісьменьнікам Брэмам Стокерам у 1897 г., не павінен выкарыстоўвацца для прыцягненьня турыстаў у Румынію. Валаскі князь Улад Цэпэш (1430—77), які стаў прататыпам для Стокера, быў «вялікім дзеячом румынскай гісторыі» й ня меў нічога супольнага зь мітычным вампірам Дракулам, падкрэсьліў прэс-сакратар.

Парк плошчаю 104 га, на ўладкаваньне якога плянавалася выдаткаваць каля 32 млн. даляраў, мусіў знаходзіцца ў Трансыльваніі — рэгіёне на захадзе Румыніі, недалёка ад мяжы з Вугоршчынай.

Ідэю стварэньня «Парку Дракулы» раней рэзка крытыкавалі лідэры Праваслаўнай, Каталіцкай і Лютэранскай цэркваў Румыніі. Супраць парку пярэчылі таксама экалягічныя арганізацыі і прадстаўнікі ЮНЭСКА, бо сярэднявечныя пабудовы Сігішаары, дзе калісьці нарадзіўся Улад Цэпэш, унесеныя ў сьпіс сусьветнай спадчыны.

**АВ**

САЛІДАРНАСЬЦЬ

# Зачыненая баскамоўная газэта

**Генэральны пракурор Каралеўства Гішпаніі пастанавіў закрыць адзіную цалкам баскамоўную газэту «Egunkaria». У віне ёй ставіцца супрацоўніцтва з тэрарыстычнай групоўкай Э.Т.А. Супрацоўнікі выданьня на чале з галоўным рэдактарам арыштаваныя.**




Тыя ж, каму пашанцавала ня трапіць за краты, пачалі рыхтаваць новы праект. Асаблівасьць гэтага здарэньня ў тым, што «Egunkaria» лічылася цэнтрысцкім выданьнем і мела накіраванасьць больш культурніцкую, чым палітычную. Закрыцьцё газэты выклікала хвалю абурэньня як у самой Краіне Баскаў, так і па ўсім каралеўстве. Цэнтральныя СМІ рэзка крытыкуюць урад, а на вуліцы Даносьціі (па-гішпанску Сан-Сэбаст'ян) выйшла больш за 100 тыс. абражаных баскаў.

Гэта ўсё адбываецца на фоне сусьветнай вайны з тэрарызмам. Гішпанія — адна з самых адданых хаўрусьніц ЗША, і гэта, на думку афіцыйнага Мадрыду, дае яму карт-бляншь на сваю маленькую вайну. Вось яна — праблема безьдзяржаўных нацыяў. Прынцыпы Дэкляраціі ААН аб праве на самастойнасьць народу абвяргаюцца яе падпісантамі. Сьвет заплюшчвае вочы на Чачэнію, Краіну Баскаў і г.д. Пасьля 11 верасьня ўсё гэта адбываецца пад прыкрыцьцём «вайны зь міжнародным тэрарызмам».

Баскам не звыкацца з рэпрэсіямі: летась была пастаўлена па-за законам незалежніцкая палітычная плятформа Батасуна («НН» №37, 2002 г.), зачыненыя культурніцкія цэнтры Тавэрны, існуе забарона на мітынгі. Такая пазыцыя Мадрыду штурхае баскаў да ўсё больш радыкальных мэтадаў змаганьня.

Баскі — народ на поўначы Ібэрыйскага паўвострава, які захаваў сваю самабытнасьць і мову. Мова баскаў своеасаблівая, яна ня мае родных у Эўропе.

**FE**

# Родная сястра мінімалкі



Большасьць грамадзянаў мае справу з базавай велічынёю тады, калі даводзіцца аддаваць грошы дзяржаве.

IREX-PROMEDIA

Працяг са старонкі 1.

## Заробак і велічыня

Цяпер «мінімалка» існуе хіба для таго, каб мы ведалі, як мала нам маюць права заплаціць. Паралельна ёй увялі мінімальны заробак за гадзіну — каб стварыць грунт для пераходу на пагадзінную тарыфікацыю аплаты працы (цяпер прынятая месячная). Заробкі бюджэтнікам ды разнастайныя плацяжы налічваюць з дапамогай не МЗ, а тарыфнай стаўкі першага разраду (з 1 студзеня яна роўная 25 тыс. рублёў). Тых, хто працуе ў прамысловасьці, зьмена тарыфнай стаўкі ня тычыцца: там яе вызначаюць асобна, у залежнасьці ад эфэктыўнасьці працы прадпрыемства.

1 сакавіка 2002 г. «мінімалку», якая дагэтуль была 10 тыс. рублёў, падвысілі да 17 тысячаў. Новаўведзеная базавая велічыня склала 10 тыс. Лёгіка зразумелая: у цяперашніх умовах мінімальны заробак мусіць расьці даволі шпарка, каб наблізіцца да ўзроўню спажывецкага мінімуму — той сумы, на якую можна неяк жыць. А вось базавая велічыня робіцца спадкаемніцай «старога» мінімальнага заробку, пра які «зайцы» ўзгадвалі толькі тады, калі іх лавіў без квітка кантралёр у аўтобусе.

Падзел на мінімальны заробак ды базавую велічыню даў уладам большую волю. Паводле закону, мінімалку можна зьмяняць толькі раз на год — 1 студзеня. Рабіць гэта так рэдка немагчыма дзеля інфляцыі. Таму падвышэньне «мінімалкі» цягам году называлі «індэксацыяй». Адбывалася яна адпаведна росту цэнаў. Пасьля ўвядзеньня базавай велічыні ўсё пайшло па-іншаму. Мінімальны заробак да канца 2002 г. ніводнага разу не падвышалі. Навошта, калі штрафы ды дзяржпошліны ад яго больш не залежаць? А вось базавую велічыню за гэты час перагледзалі два разы. Сакавіцкае падвышэньне будзе трэцім. Відаць, памер базавай велічыні рэгулюе не інфляцыя, а дзяржаўны апэтыт.

## Каму гэта выгадна

Падвышэньне БВ прыносіць і карысьць некаторым катэгорыям насельніцтва. Выгаду маюць бюджэтнікі ды вайскоўцы, якія зьбіраюцца на пэнсію. Чым большая базавая велічыня, тым больш дзяржава ім плаціць. З падвышэньнем БВ болей грошай атрымліваюць студэнты, выбітныя спартоўцы ды іх трэнэры, дзеячы, якія маюць тытул «народны», Героі Савецкага Саюзу, рэпрэсаваныя ды іх родныя. Падвышаюцца сумы, на якія дзяржава страхуе супрацоўнікаў падатковых інспэкцыяў, сэнатараў і дэпутатаў палаты прадстаўнікоў.

У некаторых выпадках рост БВ выгадны бізнэсоўцам. Замест 24% падатку з прыбытку яны могуць плаціць 15%, калі балянсавы прыбытак прадпрыемства за год не перавысі 5 тысячаў БВ (50 млн. рублёў). Фірмы, якія маюць да 15 супрацоўнікаў, могуць плаціць падаткі па спрошчанай сыстэме — 10% ад валавай выручкі, калі цягам двух кварталаў апошняя была ня большай за 5 тыс. БВ. Фінансавыя апэрацыі паміж фізычнымі асобамі ставяцца пад асаблівы кантроль, калі яны перавышаюць 2 тыс. БВ (для юрыдычных асобаў — 20 тыс.) за раз або цягам месяца. Чым вышэйшая БВ — тым большымі сумамі можна апэраваць бязь лішняе валакіты.

## Хабарнікі, спадкаемцы, дэпутаты...

Увесь Грамадзянскі кодэкс, які рэгулюе правы ўласнасьці, трымаецца на базавай велічыні.

Вы маеце права забраць сабе рэч, якая валяецца без патрэбы на вашай зямлі, толькі тады, калі яна каштуе відавочна менш за 5 БВ — 50 тыс. рублёў.

Ад базавай велічыні залежыць і памер афіцыйна дазволенага «хабару»: забараняецца рабіць падарункі коштам больш за 5 БВ дзяржаўным службоўцам, супрацоўнікам шпіталяў, адукацыйных установаў і г.д. Калі вы падазраяце некага ў плягіяце, можаце патрабаваць праз суд кампэнсацыю ў памеры ад 10 да 50 тыс. базавых велічыняў.

Калі знаёмы просіць пазычыць грошай на суму, большую за 10 БВ, — маеце права ўзяць у яго расьпіску. Аднак, каб патрабаваць працэнты, трэба даць у пяць разоў болей — 50 БВ.

Калі нехта даў вам на захаваньне рэч коштам больш за 10 БВ і патрабуе пісьмовай дамовы, не абурайцеся: ён мае на тое права. Аднак калі потым ён пра тую рэч забудзецца ці не захоча браць назад, вы можаце нават прадаць яе з аўкцыёну — праўда, для гэтага кошт рэчы павінен быць большы за 100 БВ.

Калі патэлефануюць з банку і скажуць, што багаты родзіч пакінуў вам у спадчыну буйную суму на рахунку, вы ня зможаце зьняць больш за 100 БВ, пакуль не пакажаце пасьведчаньня, што дае права на спадчыну.

Разам з базавай велічынёй падвышаюцца кампэнсацыі за нясвоечасовую дастаўку пасажыраў ды грузаў, а таксама грашовыя сумы, якія мусяць пакінуць таму, чыю маёмасьць канфіскуе суд.

Нават той, хто сядзіць за кратамі, можа мець выгаду ад павелічэньня БВ: адпаведна ёй большае сума, якую ён можа выдаткаваць на ежу ды цыгарэты. Выйграюць кандыдаты на дзяржаўныя пасады, якім выдаюць зь бюджэту пэўную колькасьць базавых велічыняў на перадвыбарчую кампанію.

## Трэба плаціць

Аднак усё згаданае вышэй — выпадкі рэдкія. Большасьць грамадзянаў мае справу з базавай велічынёю тады, калі даводзіцца аддаваць грошы дзяржаве. Разам з БВ растуць штрафы, дзяржпошліны, плата за выдачу разнастайных ліцэнзіяў ды пасьведчаньняў, а таксама за падаўжэньне тэрміну іх дзеяньня, за дзяржаўную рэгістрацыю абсталяваньня і г.д. Апошнім часам урад пачаў пераходзіць да новай тактыкі. Не чакаючы падвышэньня базавай велічыні, прымаюцца пастановы, што павялічваюць колькасьць БВ, якія трэба сплачваць у тым ці іншым выпадку. Так, 8 студзеня ўрад пастанавіў браць за ліцэнзію на вытворчасьць і аптовы продаж алькаголю ды тытуню 80 БВ замест 15. За працяг тэрміну дзеяньня ліцэнзіі будуць браць 40 БВ замест 7. Прадпрымальнікі, якія не зьяўляюцца юрыдычнымі асобамі, будуць плаціць за ліцэнзію 10 БВ (раней — 2), за яе працяг — пяць БВ замест дзьвюх.

Алесь Кудрыцкі




**Зьмяненьне мінімальнага заробку (МЗ) і базавай велічыні (БВ) ў 2001—2003 г.**

## ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

### Звольненыя дырэктары за нявыплату заробкаў

**Кіраўнікоў сямі прадпрыемстваў, якія ня здолелі спраўна плаціць заробкі, зьнялі з пасадаў.** Звольненыя дырэктары Віцебскага заводу жалезабэтонных канструкцыяў, Барысаўскага крышталёвага заводу, шклозаводу «Нёман», Менскага парцалянавага заводу, «Баранавічыдрэву», будтрэсту №21. Дырэктар Гомельскага камбінату будаўнічых канструкцыяў пазбыўся пасады за тое, што плаціў заробкі кіраўнікам ды спэцыялістам, а шараговыя работнікі сядзелі бяз грошай.

### Рэканструкцыя менскіх «хрушчобаў»

**Менгарвыканкам пастанавіў адрамантаваць у 2004—2006 г. 890 менскіх «хрушчовак».** Іх абкладуць цеплаізаляцыйнымі плітамі ды надбудуюць мансарды. На час рамонту жыхароў будуць па чарзе высяляць. Для гэтага сёлета пабудуюць два дамы на 100 кватэраў у Цэнтральным раёне. Будаўніцтва будзе каштаваць 4,4 млрд. рублёў.

### Будзе паперня ў Шклове

**Прэм'ер Генадзь Навіцкі заявіў, што цягам двух гадоў у Беларусі пабудуюць завод, які будзе вырабляць газэтную паперу.** Пакуль яе даводзіцца набываць за мяжой. 30—40% прадукцыі новага прадпрыемства хопіць, каб забясьпечыць усю краіну. Астатняе пойдзе на экспарт. Сыравіны для вырабу паперы — яловага балясту — у нас хапае. Найбольш верагодна, што збудуюць завод на базе шклоўскай папяровай фабрыкі «Спартак».

### Зямля задарагая

**У Барысаве правалiўся аўкцыён, зь якога гарадзкія ўлады спрабавалі прадаць чатыры ўчасткі пад катэджы: заяўку на ўдзел падаў толькі адзін чалавек.** Пакупнікоў напужала завялікая пачатковая цана — 1,4 млн. рублёў за ўчастак. Наступны аўкцыён — 18 сакавіка.

### Ліквідаваны Фонд сацабароны моладзі

**Указам прэзыдэнта зьліквідаваны Фонд сацыяльнай абароны моладзі.** Матывацыя — «вынікі працы не адпавядалі выдаткаваным сродкам». Фонд стварылі ў 1997 г., каб фінансаваць БПСМ. Сродкі ў фонд прыходзілі ў асноўным зь дзяржаўнага фонду спрыяньня занятасьці ды рэспубліканскага фонду аховы прыроды. Цяпер грошы, што раней ішлі ў фонд, будуць назапашвацца на рахунку Міністэрства фінансаў.

### Гешэфты «Белкамунмашу»

**«Белкамунмаш» зьбіраецца прадаваць у Ірак пажарную тэхніку.** Сума, на якую будзе падпісаная дамова, яшчэ не вядомая. Прадпрыемства будзе пастаўляць новыя пажарныя машыны, спраектаваныя на базе «МАЗаў». Завод удзельнічае ў тэндэрах на пастаўку 10 трамваяў у Пецярбург ды 20 у Баўгарыю.

### Аўтакінатэатар

**11 красавіка ў Менску адкрыюць першы ў Беларусі аўтакінатэатар.** Ля паркінгу аўтамабільнага рынку ў мікраёне Малінаўка паставілі вялізны экран. Адначасова глядзець фільм можна будзе з 500 легкавікоў. Гук пусьцяць на пэўнай FM-частаце.

### У Гомелі гасяць «начнікі»

**Гомельскія ўлады забаранілі працаваць уначы 30 крамам, барам, кавярням ды кіёскам.** Цяпер яны мусяць адчыняцца не раней за 6-ю раніцы, а зачыняцца апоўначы. Прычына — шматлікія скаргі на аматараў «начнікоў» ды рост колькасьці злачынстваў. Большасьць зачыненых кропак гандлявала алькаголем ды цыгарэтамі. У Гомелі засталося толькі 10 начных крамаў.

### Навіны чыгункі

**На Менскім вагонарамонтным заводзе зрабілі спальны вагон новай канструкцыі.** Хваляцца, што надзвычай камфортны: з кандыцыянэрамі ды лядоўнямі. Ім укамплектуюць турцягнік Віцебск—Берасьце. Да 2010 г. маркуецца паскорыць да 160 км/г хуткасьць руху міжнародных цягнікоў на ўсёй лініі Берасьце—Ворша. Цяпер гэтак разганяць іх можна толькі на пэўных адрэзках чыгункі на Берасьцейшчыне.

АК

# Мастацтва прадаваць мастацтва

**Можна захоўваць грошы, набываючы валюту ці золата. Іншае выйсьце — прыдбаць акцыі ці адкрыць рахунак у банку. А як наконт таго, каб укласьці грошы ў размаляваны кавалак палатніны? Для нас гэта вар'яцтва, але знакамітыя багацеі даўно зразумелі, што творы мастацтва добра прыдаюцца для інвэстыцыяў. З часам яны толькі даражэюць ды амаль заўсёды знаходзяць пакупніка. Калі гэта творы сапраўднага мастацтва.**
**У нас няма свайго аўкцыёну накшталт знакамітага «Sotheby's», але мастацкі рынак у Беларусі існуе. Найлепш гэта адчуваюць самі мастакі, якім даводзіцца кіраваць сваёй творчай энэргіяй у залежнасьці ад ваганьняў спажывецкага попыту ды зьменаў падатковага клімату.**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

У Сеціве багата прапановаў кшталту «прафэсійны мастак намалюе Ваш партрэт за невялікія грошы».

## Мастакі-прадпрымальнікі

Каб прадаваць працы з выставаў ці ў галерэях, мастак афармляе паперы на атрыманьне статусу індывідуальнага прадпрымальніка. Даводзіцца плаціць адзіны падатак (ад 20 эўра ў месяц) і складкі на абавязковае сацыяльнае страхаваньне (каля 12 эўра ў месяц). Але прадпрымальнікам, якія маюць яшчэ адно месца працы, закон дазваляе не плаціць «сацыялкі», таму мастакі наймаюцца весьці дзіцячыя гурткі і г.д.

Мастаку трэба майстэрня. Цяпер у любым ЖРЭУ ёсьць вольныя памяшканьні. Праўда, арэнда плошчы для вытворчай дзейнасьці пацягне 5 эўра за $м^2$ у сталіцы і 2,5 эўра — у абласных цэнтрах. І вольны мастак, які мае ў Менску майстэрню ў 15 $м^2$, мусіць плаціць штомесяц амаль 110 даляраў (уключна з падаткамі на прадпрымальніцкую дзейнасьць). Праўда, прэзыдэнцкі загад №495 пакідае льготы для сяброў творчых саюзаў (ім арэнда ў 5 разоў меншая).

## Па галерэях

Мастацкая галерэя й мастацкі салён — розныя рэчы. У першыя ходзяць, каб паглядзець на творы, у другія — каб да іх прыцаніцца.

Карціна, напісаная алейнымі фарбамі, каштуе ў менскіх мастацкіх салёнах ад 400 тыс. да 2 млн. рублёў (памер — прыкладна 1,3х1 м). Карціны вядомых мастакоў — Тоўсьціка, Шчамялёва — каштуюць ад 3—4 млн. А невялікую акварэль (20х15 см) можна набыць і за 20—30 тыс. Батык каштуе пад 130 тыс. рублёў (40х55 см). Авангардны керамічны сэрвіз можна прыдбаць за 100—130 тыс. Арыгінальныя прадметы для інтэр'еру каштуюць 20—150 тыс. Ня блытайце з мастацкімі салёнамі «модныя» сувэнірныя крамы. У апошніх прадаюць па немалой цане вырабы, што набываюць за мяжой па мізэрным кошце. Твораў беларускіх мастакоў на рэалізацыю крамы не бяруць. Іх цікавяць аптовыя партыі, а не ўнікальныя працы.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## Тутэйшыя Манмартры

Менскі арт-рынак увесь час вандруе. Спачатку ён месьціўся на праспэкце Скарыны ля галерэі «Мастацтва», потым пераехаў на плошчу Свабоды. Калі распачалі аднаўляць менскую ратушу, мастакоў уціснулі паміж музэем Вялікай Айчыннай вайны ды Палацам прафсаюзаў. Новы «Вэрнісаж» схаваны ад вачэй пакупнікоў ды знаходзіцца на скрыжаваньні каналізацыйных трубаправодаў. Незадаволеныя мастакі падаліся былі да ўнівэрмагу «Беларусь», але там гандаль ішоў яшчэ горш.

На «Вэрнісажы» вобмаль мастацкіх твораў — адно рамесьніцтва. Насамрэч, там і мастакоў небагата. У асноўным рэалізатары, якія прадаюць зробленае іншымі (паводле папераў, вядома, на «Вэрнісажы» працуюць спрэс творцы). Сярэдняя цана карціны, напісанай алеем, — 50 даляраў. Можна адшукаць як маленькія карцінкі за 10—20 даляраў, гэтак і вялізныя за 300 з гакам.

## Праз Інтэрнэт

У беларускім Сеціве ўсяго некалькі віртуальных галерэяў, экспазыцыі якіх амаль не абнаўляюцца. Мала знаходзіцца ахвотных набыць карціну за пару сотняў даляраў на падставе маленечкага фатаздымку ды кароткага апісаньня. Нямала будзе каштаваць і перасылка. А як плаціць? Дасылаць грошы поштай? Перавoдзіць на рахунак? Мала хто рызыкне набываць карціну праз кампутар.

А вось пэрсанальны сайт для мастака — выдатны спосаб самарэклямы, нават калі праз яго нічога не прадасі. Няблага шукаць праз сайт замовы на творы. У Сеціве багата прапановаў кшталту «прафэсійны мастак намалюе Ваш партрэт за невялікія грошы».

## Пакупнікі

Каб арт-рынак запрацаваў, адных вытворцаў ды прадаўцоў мала. Патрэбныя пакупнікі. Людзі з грашыма. Пра тое, што яны ёсьць, сьведчыць колькасьць дарагіх легкавікоў, што пралятаюць праспэктам Скарыны за хвіліну. Мабыць, калі пэрыяд «першапачатковага ўзбагачэньня» міне, прыйдзе пэрыяд «вялікага абсталяваньня інтэр'ераў» — вялікая пара для мастацтва.

**Алесь Кудрыцкі**

КАМЭНТАРЫ

## Іў Прудом: «Набывайце ў галерэях»



Іў Прудом, фінансіст паводле адукацыі, вывучаў эканоміку й маркетынг у Парыжы. Прыехаў у Беларусь у 1995 г. як дырэктар буйной нафтавай кампаніі. Тут ажаніўся. Спрабаваў зладзіць у Беларусі лятарэю, аднак дзяржава манапалізавала гэты бізнэс. Цяпер — гаспадар менскай мастацкай галерэі «Зямля людзей» (вул. Рэвалюцыйная, 13).

**«НН»: Ці вашая галерэя — камэрцыйнае прадпрыемства?**

**Іў Прудом:** Мая галерэя задумвалася як камэрцыйны праект. Аднак цяпер зарабляць грошы на мастацтве вельмі цяжка. Я ў асноўным дапамагаю беларускаму мастацтву разьвівацца, даючы творцам магчымасьць паказаць свае працы.

**«НН»: Хто набывае творы ў Вашай галерэі?**

**І.П.:** Замежнікі. Багатыя беларусы радзей карыстаюцца паслугамі галерэяў — яны замаўляюць карціны непасрэдна ў мастакоў. Гэта яшчэ адна асаблівасьць беларускага арт-бізнэсу.

**«НН»: Ці шмат праблемаў вы маеце зь бюракратыяй?**

**І.П.:** Столькі, колькі любая прыватная фірма ў гэтай краіне.

**«НН»: Як Вы ахарактарызуеце беларускі рынак твораў мастацтва?**

**І.П.:** Яму яшчэ трэба разьвівацца. Людзі не падрыхтаваныя набываць творы мастацтва ў галерэях. Яны прызвычаіліся набываць іх у мастацкіх салёнах, дзе разам прадаюцца розныя творы розных мастакоў. Аднак набываць карціны з выставы, дзе паказваюць творы аднаго мастака, — гэта яшчэ нешта незразумелае й невядомае.

**«НН»: Ці можна зарабляць на продажы твораў мастацтва праз Інтэрнэт?**

**І.П.:** Вядома, не. Нашая галерэя мае сайт, аднак ён прызначаны для таго, каб падтрымліваць кантакты зь іншымі галерэямі. Сур'ёзна займацца мастацкім бізнэсам праз Інтэрнэт могуць толькі сусьветна вядомыя аўкцыёны.

## Уладзімер Басалыга: «Хутка нормы паменяюць»



Уладзімер Басалыга, старшыня Беларускага саюзу мастакоў:

— Адпаведна з законам, што рэгулюе дзейнасьць творчых саюзаў, творчая дзейнасьць не зьяўляецца прадпрымальніцтвам, акрамя тых выпадкаў, калі яна мае сыстэматычны характар. Паняцьце «сыстэматычнасьці» анідзе не патлумачана. Дастаткова мастаку два разы на год прадаць свае творы, як ён аўтаматычна пападае ў шэраг прадпрымальнікаў і мусіць рэгістравацца. Адбылося некалькі судоў, аднак усе яны скончыліся не на карысьць мастакоў. Ім далі штрафы за тое, што працавалі, ня маючы пасьведчаньня індывідуальнага прадпрымальніка. Нядаўна ў Міністэрстве культуры нам паведамілі, што падрыхтаваны новы нарматыўны акт, у якім даецца тлумачэньне панятку «сыстэматычна» — больш за трыццаць разоў у год. Я сумняваюся, што нехта з мастакоў прадае трыццаць карцін у год, таму гэтая норма нас задаволіць.

**«НН»: Мастак прапануе карціны, прадпрымальнік — тавары ці паслугі. У чым розьніца?**

**У.Б.:** Стваральная праца й прадпрымальніцтва не адное і тое ж. Творчы працэс нельга раскласьці на элемэнты кшталту «ўзяў — прынёс — паклаў — прадаў», скласьці рахунак за бэнзын і гэтак далей. Ну добра, можна падлічыць, колькі каштавалі фарбы, пэндзлі, папера — але як падлічыць колькасьць творчай задумы, укладзенай у твор? Прадпрымальнік увесь час займаецца прадпрымальніцтвам, а я магу тры месяцы думаць — і толькі потым стварыць нешта. Які падатак я мушу плаціць за тры месяцы, калі думаў?

**«НН»: Колькі ўсяго мастакоў у Беларусі?**

**У.Б.:** У Саюзе мастакоў 1126 сяброў. А ўсяго мастакоў у Беларусі, я думаю, тысячаў 5—6.

**АК**

ЯК У ІНШЫХ

### Эліс Палсэр, скульптар з Сафалку, Вялікая Брытанія (www.palser.co.uk)

У Злучаным Каралеўстве ня трэба рэгістравацца, каб быць мастаком, аднак падаткі з прададзеных працаў плаціць трэба. Некаторыя мастакі, якія дзе-небудзь працуюць на поўную стаўку, а мастацтвам займаюцца ў вольны час, не пазначаюць у дэклярацыі прыбыткаў ад продажу сваіх працаў. Гэта, аднак, незаконна. Падатак на продаж карцінаў такі самы, як і іншыя. Калі вы зарабляеце менш за 4 тыс. фунтаў стэрлінгаў (каля 13 млн. рублёў), падатку плаціць ня трэба. Падатак на прыбытак ад 4 да 30 тыс. фунтаў складае 22%, ад 30 тыс. — 40%. Калі зарабілі больш за 50 тыс. — плаціце дадатковы падатак, 17,5%. Звычайна галерэі дадаюць суму падатку да цаны твораў, якія прадаюць.

### Джэймз Кемэран Сьпіраф, мастак-кераміст з Флорыды, ЗША. (www.clayman.com)

Фармальна я мушу атрымаць ад мясцовых уладаў ліцэнзію на бізнэс. Сьпярша я спрабаваў рабіць усё па правілах, аднак хутка пераканаўся, што прафэсійна займацца керамікай у жылых раёнах не дазваляецца: даводзіцца ж карыстацца печамі для абпальваньня, хімікатамі для паліваньня. Потым я пераехаў і ўжо нічога пра свой занятак уладам не паведамляў. Калі нейкі правяральшчык заходзіў у дом, я казаў, што кераміка — маё хобі, на якое дазвол не патрэбны. Я ціхенька працую так ужо два гады, і на мяне пакуль ніхто ня скардзіўся (для гэтага давялося пасябраваць з усімі суседзямі).

# З вар'ятамі не размаўляюць

**Прачытаў артыкул Сяргея Дубаўца «Вайна — гэта бяда» і выказваю сваю нязгоду зь некаторымі пасажамі. Я той «тэарэтык», які дзіцём увайшоў у вайну, зьведаў і вошаў, і каросту, і ліхаманку, і тыф, і голад, і нястачу.** У памяці і немцы, і партызаны. Сербануў так, што і ў маіх дзяцей ды ўнукаў адрыжка. Сп.Дубавец ваенныя дзеяньні па адхіленьні дыктатара ад улады называе вайною. Чаму вайна? Гэта не вайна супраць краіны, народу, а зьмена рэжыму, ізаляцыя дыктатара, нацыянальнага і патэнцыйна сусьветнага тэрарыста з дапамогай вайсковай сілы дэмакратычнай дзяржавы.

Калі б у 1937—39 г. янкі змаглі высокадакладнымі сродкамі зьнішчыць бункер з Гітлерам і ягонымі памагатымі, мо не было б і таго, што прывяло да Нюрнбэргу. І ўсё роўна былі тыя нелюдзі павешаныя, расстраляныя ці пажыцьцёва зьняволеныя. А галоўнае — колькі б зьберагліжыцьцяў. Сярод тых, хто гіне, доля сумленных, шчырых людзей значна большая, чым сярод тых, хто застаецца. Сумленныя ў бядзе заўсёды наперадзе. Парасткі тых шчырых, што паклалі галовы на вайне, мерлі з голаду, холаду, хаваючыся ад галечы, беглі ў белы сьвет. Усе гэтыя беды прынёс вар'ят, своечасова ня стрыманы «размовамі». Мо лепей прышчык лячыць, чым чакаць на мэтастазы раку.

Вы, спадар Дубавец, прапануеце з вар'ятам размаўляць. Але вар'яцтва — хвароба і размовамі яе не пераможаш. Вар'ятаў трэба ізаляваць і лячыць. Каб Хусэйн ня быў вар'ятам, то сышоў бы з палітычнай арэны і такім чынам прадухіліў бы бомбавы ўдар па краіне, палітычную і эканамічную ізаляцыю. Але ён не шкадуе народу, а толькі беражэ сваю скуру.

Хто супраць дзеяньняў ЗША ў Іраку? Пуцін (а сам душыць Чачэнію і патрабуе, каб змагароў за незалежнасьць лічылі бандытамі), Лукашэнка (каб ня быць наступным), Кім Чэн Ір (ён наступны), Фідэль Кастра і «дэмакраты», якія заплюшчылі вочы на Чачэнію і кажуць — хай будзе ўсё так, як ёсьць, а то ЗША ўзвысяцца. Палітыканы, а мо хворыя дзіцячай наіўнасьцю дэмакратаў.

**Уладзімер Якімавіч, Маладэчна**

# Бог даў мне мову

**Шаноўны спадар Лявон Вольскі! Прачытанае ў Вашым артыкуле мяне таксама моцна і даўно хвалюе. Я не зьбіраюся Вам пярэчыць альбо ў нечым Вас папраўляць. Мой клопат — выказаць свой погляд на сёньняшняе становішча са стаўленьнем да роднай мовы ў беларускім грамадзтве.**

Можна пачуць: «Дрэнны, дурны народ!» Для мяне гэта незразумела, як незразумела і «дрэнны лес», «дрэнны акіян» і г.д. У любым грамадзтве ёсьць свае выродкі, паскуднікі, недарэкі. Але ж гэта не азначае, што ўвесь народ дрэнны.

На жаль, у беларускім грамадзтве сёньня назіраецца хутчэй духоўная дэградацыя, чым духоўны ўздым. І гэта ня дзіўна. Дзесяцігодзьдзі пад уладай бандытаў і цемрашалаў. Учора яны разбуралі храмы духоўнасьці, трымалі пад страхам вынішчэньня іншадумцаў, сёньня дзеляць народ на сваіх і не сваіх, расейцаў і беларусаў, праваслаўных і іншаверцаў.

Большая частка грамадзтва духоўна дэзарыентаваная: каму верыць, да якіх ідэалаў імкнуцца? І вось ім прапаноўваецца адраджэньне, станаўленьне нармальнай, гарманічнай дзяржавы праз мову. Беларускую, зразумела. А ў прыклад ім Вы прыводзіце сябе — беларускага літаратара, які размаўляе на роднай мове.

Вы разумееце, чаму ў іншамоўных людзей гэта вызывае скептычную ўсьмешку, часам агрэсію і толькі зрэдку — паразуменьне? Бо яны — не беларускія літаратары. Паразуменьне ж, па большасьці, Вы знойдзеце ў такіх, як і Вы, літаратараў, навукоўцаў, настаўнікаў і г.д. Як лічаць ва ўсім сьвеце — у эліты грамадзтва. Бо менавіта яна стварае культуру любой краіны. Ну і, безумоўна, беражэ мову. Роля другой часткі грамадзтва — спажываньне пладоў культуры.

Што можа аб'яднаць сёньня гэтыя дзьве такія розныя часткі нашага грамадзтва?

Я прачытаў мноства газэтных артыкулаў, прысьвечаных гэтай тэме. Толькі ў адзіным я знайшоў прапанову скарыстацца Сьвятым Пісаньнем для вызначэньня нацыянальнай ідэі. Якую карысьць прыносіць вера ў Госпада палякам, італьянцам ды іншым моцным нацыям, такую можа даць і беларусам.

Калі я гэта зразумеў, тады перастаў даводзіць усім, што я размаўляю па-беларуску таму, што я беларускі настаўнік і нават працую ў беларускай школе. Адказ стаў адзін: «На тое воля Госпада!» Гэта сьціслая фармулёўка. Для тых, хто не разумее, даю даступнае тлумачэньне: Бог стварыў чалавека. Даў яму культуру, якая ў кожнай супольнасьці людзей своя. І самае галоўнае — Бог вызначыў мне месца для служэньня яму менавіта на тэрыторыі беларускай культуры, мовы. Служачы ёй, я служу Госпаду. Калі я адмоўлюся, то вазьму на сябе вялікі грэх. Чаму ж нам, грэшным, Гасподзь павінен даваць лепшае жыцьцё? Мушу прызнацца, што ня толькі Сьвятое Пісьмо, але і геніяльны верш Натальлі Арсеньневай «Магутны Божа» даў мне магчымасьць прыйсьці да такой высновы. Вось гэты радок: «...павагу, сілу і веліч веры ў нашу праўду, у *прышласьць* дай...».

Я ўпэўнены, што не Надзея, а Вера паміраe апошняй. Дайце Веру ў мудрасьць Усявышняга беларускім людзям, і ў іх умацуецца Надзея на лепшае жыцьцё. І яны вернуцца да сваёй культуры і мовы.

**Алесь Грыгор'еў, Менск**

## Мужчынскі дзень

**Першы тыдзень вясны!.. Блакітныя стужкі нябёсаў спавілі чорныя раскудлачаныя галіны дрэў.** Гарэзьлівы праменьчык нечакана пацалаваў цябе ў шчаку і паляцеў далей. Галава круціцца ад водару сонца і мяккага паветра. І ты шчасьлівы толькі таму, што жывеш і дыхаеш! Але радасьць можа перапыніцца раптоўным пытаньнем: што прэзэнтаваць каханай (маці, цешчы, сяброўцы і г.д.) на Восьмага сакавіка? Вочы шнараць па прылаўках, пальцы мацаюць кішэні. Можна падараваць стандартныя кветкі і цукеркі, а можна — той самы зграбненькі мэдальён з зубу ціхаакіянскай белай акулы, пра які Яна марыць ужо даўно. Лёгіка зразумелая? Вось і цудоўна. Вы ж і безь мяне ведаеце, што галоўнае — не наяўнасьць падарунку, а праява ўвагі і любві.

Толькі незразумела, чаму гэтую любоў (каханьне?) трэба дэманстраваць выключна Восьмага сакавіка. Хіба толькі ў гэты дзень мужчыны знаходзяць сілы паводзіць сябе як сапраўдныя мужчыны, а потым ператвараюцца ў асобін мужчынскага полу, здольных аддаваць каманды: звары і памый, хадзем спаць — і ніяздольных на самую сціплую падзяку, проста неабходную жанчыне?

Сьвяткаваць Міжнародны жаночы дзень прапанавала Клара Цэткін на 2-й міжнароднай канфэрэнцыі сацыялістак у Капэнгагене ў 1910 г. У СССР і іншых сацыялістычных дзяржавах Жаночы дзень праходзіў пад знакам мабілізацыі кабет, вызваленых ад сацыяльнага прыгнёту, якія атрымалі роўныя правы з мужчынамі. Прасьцей кажучы, жанчыны мелі афіцыйную магчымасьць на 24 гадзіны ўсьвядоміць сябе жанчынамі ў поўным сэнсе гэтага слова. Але агульнае жаночае самаўспрыманьне захавалася: мой дзень — у сакавіку, а цягам году я ўжо не жанчына, а таварыш. Такая псыхалёгія на руку мужчынам.

У старым часопісе неяк прачытала парады, як зрабіць жонцы сюрпрыз на 8 сакавіка, — прыгатаваць сьвяточную вячэру. «Бо адзін дзень — ня ўсё жыцьцё», — іранічна заўважыў аўтар. Мужчыны ахвяруюць дзеля жанчын адным днём, а жанчыны — трымастамі шасьцюдзесяцьцю чатырма. І робіцца чамусьці гідка, калі ў восьмы дзень вясны зь цябе пачынаюць зьдзьмухваць пылінкі і апякуюцца табой, нібы ты — цяплічная мімоза. Быццам замольваюць грахі.

А мне летась 8 сакавіка хлапец падарыў вялікую аксамітную чырвона-барвовую ружу. Лёгкія шэрыя хмаркі плылі, адлюстроўваючыся ў яго вачах. Я павольна ішла дадому, і мне падумалася, што сьвята 8 сакавіка можна было б назваць мужчынскім днём. Бо ў гэты дзень мужчыны прыгадваюць, што яны Мужчыны, і напамінаюць жанчынам, што яны — Жанчыны.

**Юлія Інышава, Менск**

## Фэномэн Маўглі

**Прачытаў у «НН» №5 навуковую даведку «Фэномэн Козела» і ўзгадаў іншы фэномэн, «фэномэн Маўглі».** Немагчымасьць стаць нармальным, калі шмат гадоў жыў у ненармальным асяродзьдзі, і завецца «фэноменам Маўглі». Сюды ж можна аднесьці «саўкавасьць». Звычка спадзявацца на правадыра, безыніцыятыўнасьць, адсутнасьць пачуцьця адказнасьці, страх перад спэцслужбамі, побытавая неахайнасьць, алькагалізм і іншыя «дасягненьні сацыялізму» як масавую зьяву можна пераадолець толькі пры зьмене пакаленьняў.

**Сяржук, tut.by**

## «Спадчына» вярнулася



**Пасьля доўгага перапынку зноў пачаў выходзіць часопіс «Спадчына».**

Нумар 2—3 за 2002 г., падрыхтаваны яшчэ пад кіраўніцтвам былога галоўнага рэдактара Захара Шыбекі, выйшаў дзякуючы ахвяраваньню аднаго гісторыка-аматара. Наклад — 996 ас. Рэдакцыя абяцае, што наступны нумар «Спадчыны» выйдзе ў новым, вялікім фармаце, але зь меншай колькасьцю старонак.

# Мары ня марныя

**Нашто чакаць, як Пятра дзеля сыру, тае сьветлае будучыні, калі сілаю сваіх мараў, думак і намераў мы можам ствараць яе папросту цяпер!** Кожны з нас з думкаю ды ўяўленьнем можа рассаджваць вакол ружы, будаваць сабе дом, дапамагаць людзям, — і ўсё гэта насамрэч узьнікне ў высокіх сфэрах іншасьвету, як узьнікаюць з пары аблокі. А ўсё існае там віртуальна-нябеснае ўцелавіцца і зьдзейсьніцца ў нашым сьвеце людзей, калі прыцягнецца магнітам падобнае чыстае думкі. Таму й кажуць, што ідэі лётаюць у паветры. Але ніколі ня марце чорнага, бо ўсё, чаго мы зычым іншым, мы зычым сабе, чорная мара вернецца бумэрангам. Наша зброя — сьвятло, набліжаючыся да якога, цемра зьнікае. Таму годзе скардзіцца на ўлады і беднасьць, бо галоўная бяда — улада дурноты, беднасьць думкі і сьвядомасьці. А ў Бога даброт для нас многа.

Прыгожыя мары — найвялікшае з створанага чалавекам. Бо мары заўжды пераўзыходзяць зьдзейсьненае. Іх радзіма — нябесныя вышыні. А чалавек-летуценьнік з хуткасьцю думкі лётае ў марах, развогнены натхненьнем.

Няхай кожны з нас адно паверыць, не лянуецца ды штохвілінна ствараe ў марах шчасьце сабе, Бацькаўшчыне. На глебе чалавечага духу зерне мары прарасьце парасткам намеру і прынясе плод дзеяньня. Вось чаму мары ня марныя. Нам дастаткова мець толькі тое, эвангельскае, гарчычнае зерне веры ды сілы волі, каб ажыцьцявіць прыгожую мару тут, на зямлі, увасобіць колясаўскую Новую Зямлю, Новую Беларусь.

**Алесь Бакач, Баранавічы**

## У зязюльчыным барку

**Каму што баліць, той пра тое й рупіцца. Нашаніўцы вунь пра лепшыя кнігі 2002 г. турбуюцца.** Просяць лепшых людзей скласьці лепшыя думкі пра лепшыя кнігі. А хто просіць водгукаў, рэцэнзіяў ці хоць нейкае рэакцыі на свае творы. Хоць бы сабака які забрахаў, каб ня быць аднаму ў пустэльні. Часта абыякавасьць сяброў зьнішчожвае больш, чым брахня ворагаў.

У канцы траўня 2002 г. на маё імя з Харкава прыйшла бандэроль з 10 кнігамі ад Маі Львовіч. «У зязюльчыным барку» называецца. У бандэролі ляжаў сьпіс, дзе паясьнялася, каму тыя кнігі перадаць. Побач са знакамітымі імёнамі (Арлову для «Свабоды», Мальдзісу асабіста і для бібліятэкі МАБ, Брылю, Ул.Мехаву) называліся нікому не вядомыя.

Колькі ж гэта высілкаў каштавала — беднай жанчыне і самотнай Паэтцы напісаць вершы па-нашаму і па-ўкраінску, вырабіць кнігу ды яшчэ даслаць на Бацькаўшчыну! Мне здаецца, што прыходзіць нарэшце час, калі пасыпліцца, як тое лісьце з восеньскіх дрэў, водгукі на Маіну кнігу, бо першая вестка ў «Кантактах і дыялёгах» ужо была. Няхай сыпліцца. І чым болей, тым лепей. Цяплей будзе нашай Зямельцы на зіму...

**Ганна Матусэвіч, Койданава**

# У Эўропу з асьцярожнасьцю

**Рэфармаваць Беларусь патрэбна, аднак пабудаваны не на традыцыйнай хрысьціянскай этыцы эканамічны дабрабыт прывядзе да духоўнага заняпаду.** Сьцьверджаньне аб выхаваньні культуры пасьля далучэньня да Эўропы сумнеўнае, хіба што на вуліцах чысьцей зробіцца. Цікава, якім гэта чынам «сямейныя повязі будуць мацнець», калі лібэральнае рынкавае заканадаўства зьнішчае іх эканамічны падмурак, забясьпечваючы раньнюю самастойнасьць дзяцей, лёгкія магчымасьці для разводу і падзелу сямейнай маёмасьці ды здрабняючы апошнюю ў часе насьледаваньня.

Трэба крытычна ўглядзецца ў эўрапейскія рэаліі і выкарыстоўваць толькі той досьвед, што не замінае ўзмацненьню такіх інстытутаў, як сям'я, мясцовае самакіраваньне.

Эканамічная і палітычная інтэграцыя з Эўропай павінна прадугледжваць адмову ад выкананьня непрымальных дырэктыў ад эўрапейскіх наднацыянальных урадаў, што адпавядае канцэпцыі разнахуткаснай Эўропы. Беларусь павінна быць адным з бастыёнаў кансэрватыўнай, хрысьціянскай апазіцыі ў Эўразьвязе. А гэтага магчыма дасягнуць толькі праз абарону сваёй зямлі, культуры ды традыцыйнага беларускага хрысьціянства.

**Зданак Кавальскі, Наваполацак**

# Нямецкае перавыданьне Скарыны


ПОЧИНАЄТЬСѦ КНИГА ДЕЯНИИ • И ПОСЪЛАНИИ АПОСТОЛЬСКИЯ ЗОВЕМЫИ АПОСТОЛЪ, ЗБОЖИЮ ПОМОЧЬЮ СПРАВЛЕНА ДОКТОРОМЪ ФРАНЦИСКОМЪ СКОРИНОЮ СПОЛОЦЬКА :-

**Пры канцы 2002 г. пабачыла сьвет факсымільнае выданьне Скарынавага «Апосталу». Таўшчэзны (1000 старонак з гакам) фаліянт выйшаў у рамках нямецкага кніжнага праекту «Biblia Slavica». Немцы ўклалі ў публікацыю больш за 100 тыс. даляраў.**

«Апостал» быў надрукаваны ў Вільні ў 1525 г. Над перавыданьнем 10 гадоў працавала беларуска-нямецкая група навукоўцаў. Зь нямецкага боку праектам кіраваў прафэсар Бонскага ўнівэрсытэту Ганс Ротэ, зь беларускага — прафэсар таго ж унівэрсытэту Ўладзімер Сакалоўскі. На сёньня перавыдадзеныя ўсе Скарынавы першадрукі, акрамя «Малой падарожнай кніжыцы». Немцы меркавалі выдаць і поўны варыянт Скарынавай «Бібліі», але спыніла іх тое, што кніга ўжо выйшла ў Беларусі на пачатку 90-х. Аднак супольны праект будзе працягвацца.

Факсымільнае выданьне суправаджаецца навуковымі артыкуламі, прысьвечанымі «Апосталу». Прафэсар Г.Ротэ прааналізаваў крыніцы, зь якіх Скарына перакладаў сваю кнігу. Іван Саверчанка, Георгі Галенчанка, Аркадзь Жураўскі, Уладзімер Конан, Уладзімер Сьвяжынскі, Віктар Шматаў, прафэсар Лёнданскага ўнівэрсытэту Арнольд МакМілін разглядалі Скарынаўскі «Апостал» кожны з сваёй званіцы.

У Беларусь трапілі толькі 8 асобнікаў выданьня. Яны дасланыя беларускім удзельнікам праекту. Паводле словаў доктара філялягічных навук І.Саверчанкі, кіраўніцтва Акадэміі навук зьбіраецца набыць некалькі асобнікаў для НАН і Нацыянальнай бібліятэкі. Кніга каштуе 150 даляраў.

**АВ**

ТАЯМНІЦЫ ГІСТОРЫІ

# Сталін мог загінуць на пяць гадоў раней

**5 сакавіка спаўняецца 50 гадоў з дня сьмерці Сталіна.**

У лютым 1949 г. беларускі эміграцыйны друк паведамляе сэнсацыйную навіну з СССР. «Беларускае слова» 5 лютага друкуе зацемку «Замах беларускае «Чорнае Кошкі» на Сталіна». На наступны дзень «Бацькаўшчына» працягвае тэму: «Атэнтат на Сталіна прыгатаваны беларускай партызанскай арганізацыяй».

Паводле гэтых публікацый, замах на чырвонага дыктатара адбыўся пры канцы кастрычніка 1948 г. на вайсковым палігоне каля Горкага (Ніжняга Ноўгараду). Сталін аглядаў новыя савецкія танкі. Падчас параду адна з баявых машынаў спынілася перад трыбунай і танкіст колькі разоў стрэліў з аўтамата ці пісталета ў бок Сталіна. Але не пацэліў ды сам загінуў. Іншы тэрарыст, якога ўзялі жывым, паведаміў на допыце, што «яны ў паразуменьні з украінскімі і беларускімі партызанамі хацелі забіць Сталіна».


Замах беларускае «Чорнае Кошкі» на Сталіна

Беларускі эміграцыйны друк актыўна зрэагаваў на сэнсацыйную вестку.

Беларускія газэты, друкуючы гэтую інфармацыю, паведамлялі, што ўзялі яе зь нямецкіх выданьняў, а тыя — з турэцкіх. Такі ланцужок выклікае недавер да факту. У 1997 г. выказаў сумнеў наконт яго праўдзівасьці супрацоўнік Цэнтру інфармацыі і грамадзкіх сувязяў КДБ Ігар Іваноўскі. Прафэсар Таронцкага ўнівэрсытэту, адказны рэдактар выдавецтва «Літопис УПА» Пятро Пацічны кажа, што Ўкраінская паўстанчая армія не магла браць удзел у падрыхтоўцы замаху. Прынамсі, пра гэта яму невядома.

Праўда, толькі апошнім часам стала вядома пра шэраг ранейшых замахаў на «правадыра». Напрыклад, пра тое, што ў лютым 1939-га больш за дзесяць невядомых «камандас» прабіваліся да кунцаўскага лецішча Сталіна. У баі загінулі 30 чэкістаў і ўсе тэрарысты, якія так і не былі апазнаныя…

Пра замах 1948 г. згадваў беларускі партызан, які ў 1949 г. праз Польшчу і Заходні Бэрлін перабраўся ў Заходнюю Нямеччыну. «Наш атэнтат на Сталіна не задаўся», — пісаў ён у эміграцыйным бюлетэні саюзу беларускіх журналістаў «Вольнае слова» (нумар за студзень-люты 1950-га). Як відаць з той публікацыі, чалавек ён быў добра інфармаваны. Напрыклад, ведаў дэталі закрытага суду над паэткай Ларысай Геніюш.

Дагэтуль застаецца загадкай і сьмерць Сталіна. Ёсьць вэрсія, што памерці яму «дапамог» Лаўрэнці Берыя. Перад тым Берыя пазбавіўся начальніка Сталінавай асабістай аховы Мікалая Ўласіка — беларуса з Слонімшчыны, які знаходзіўся на гэнай пасадзе з 1920-х. Калі браць на веру гэтую вэрсію, 5 сакавіка можна лічыць днём замахаў. У той дзень, але ў 1943-м у Менску забілі лідэра беларускіх нацыянал-сацыялістаў Фабіяна Акінчыца. 13 сакавіка рапарт пра гэты тэракт ужо ляжаў на стале Іосіфа Сталіна.

**Сяргей Ёрш**

# Напад на капліцу


Рыма-каталіцкая парафія Маці Божай Будслаўскай існуе з 1991 г. За гэты час на яе тройчы нападалі вандалы. Першым разам быў спалены вагончык, дзе месьцілася капліца, другім — зьбіты драўляны дашок. Вернікі марацьпра парафіяльны касьцёл, але на яго пакуль няма грошай.

**На Дзень сьвятога Валянціна невядомыя ўчынілі акт вандалізму ў рыма-каталіцкай капліцы, што ў Кунцаўшчыне ў Менску.**

Капліца месьціцца ў вагончыку, падобным да будаўнічага. Побач стаіць колькіметровы драўляны крыж. Сюды прыходзяць у нядзелі дзясяткі вернікаў парафіі Маці Божай Будслаўскай. Аднойчы, прыйшоўшы раніцай у капліцу, яны пабачылі сьляды начнога нападу…

Паводле словаў айца Юзафа, уначы вандалы выламалі дзьверы вагончыка-капліцы, зьнішчылі ікону, алтарны крыж, фігурку Маці Божай, якую вернікі прывезьлі зь пілігрымкі, зламалі мэблю, намалявалі на сьцяне сатанінскую зорку.

«Гэта зрабілі сатаністы, — лічыць а.Юзаф. — Яны недалёка маюць базу, праводзяць сходы». Сам айцец Юзаф служыць у гэтай парафіі толькі другі месяц. Ён кажа, што нападалі на капліцу і раней, яшчэ да яго. У цэнтры сталіцы рабіць гэткае паскудзтва баяцца, а тут, на ўскраіне, яны сьмялейшыя. Міліцыя шукае зламысьнікаў.

**СЁ**


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

ВЯРТАНЬНЕ

# Езуіцкі калегіюм перадалі ўнівэрсытэту

**У Полацку надарылася падзея, якой чакалі 15 гадоў. Міністэрства абароны перадало Полацкаму дзяржунівэрсытэту комплекс былога Езуіцкага калегіюму.**

21 лютага адбыўся ўрачысты акт перадачы памяшканьняў. На іх плошчах рэктар унівэрсытэту доктар Эрнст Бабенка мяркуе разьмясьціць гуманітарныя факультэты, а таксама музэй адукацыі. На ўрачыстасьці прысутнічалі госьці зь Менску, Віцебску, прадстаўнікі польскага пасольства, пісьменьнік Уладзімер Арлоў.

**Вінцэсь Мудроў, радыё «Свабода»**

МУЗЫЧНЫ ШАПІК

## Стары Ольса. Verbum.

(р) 2003

Гэты альбом музыкі прысьвяцілі 450-годзьдзю Рэфармацыі ў Беларусі. Яны прапануюць сваім слухачам зьдзейсьніць падарожжа ў мінулае ды паслухаць старадаўнія забытыя мэлёдыі й урыўкі з шэдэўраў пісьменства. Зьміцер Сасноўскі чытае сярэднявечныя творы мовамі арыгіналу: «Песьню пра зубра» — лацінай, «Слова пра паход Ігаравы» — стараславянскай, а «Статут ВКЛ» — старабеларускай. Але на вокладцы разам з арыгінальным тэкстам даецца пераклад тых самых урыўкаў на беларускую мову. Урывак з «Слова...» і «Зварот Лява Сапегі да Караля» сам Сасноўскі й пераклаў. Пэўна, што 11-хвілінны трэк з дэклямаваньнем «Слова пра паход Ігаравы» і 17-хвіліннае цытаваньне Статуту ВКЛ — цьвікі гэтай праграмы. Назва альбому — «Verbum» (ад лац. «слова») — апраўдвае сябе: слова тут грае, можа, большую ролю, чымся музыка.

Але розных старадаўніх мэлёдыяў таксама хапае: з дапамогай такіх рэдкіх інструмэнтаў, як лютня (іх чатыры ва ўсёй Беларусі), колавая ліра, варган і інш., былі адноўленыя сярэднявечныя танцы «Бранль», «Выправа», «Батура». Вартая ўвагі й тэма з славутага Ягелёнскага рукапісу XVI ст., які насамрэч быў знойдзены на Берасьцейшчыне.

Выйшла сапраўдная вандроўка па нашай гісторыі. «Verbum» — плён намаганьняў ня толькі музыкаў «Старога Ольсы», спрычыніліся да ягонага выхаду такія людзі, як Ірэна Каляда, Алесь Жлутка, Вінцук Вячорка і інш.

## Гіп-гоп нацыя-3.

Зборнік беларускага рэпу. (р) 2003

Беларускія рэпэры, у адрозьненьне ад заходніх, людзі мірныя. Усе трымаюцца разам, ладзяцца. BMA-group рыхтуе супольны беларускамоўны гіп-гопавы зборнік «Пасадзіў DEAD REAPку»... А пакуль выйшла «Нацыя-3». На дыску гучаць трэкі «бандаў» зь Менску, Воршы, Гомелю, Маладэчна, Барысава. Беларускія рэпэры ня толькі заклікаюць любіць музыку і танчыць, але і закранаюць у сваіх тэкстах сацыяльную тэматыку. Не задавальнае рэпэраў рэчаіснасьць, хоць яны і апалітычныя. Музыка ў асноўным нэрвовая, з хаатычным рытмам, стыль «чытаньня» тэкстаў — эмацыйны. Асабліва тут вызначаюцца «Хлоп-Ч», «Ланцугі» і «Гарадзкая туга».




Будучыня па-рэпэрску — гэта сьвет не аднастайны, вольны, дзе ва ўсіх роўныя шанцы на самарэалізацыю, дзе няма жорсткасьці, страху і разьвітаньняў, а ёсьць толькі ўзаемапавага і каханьне. Усе займаюцца спортам (неабавязкова скейтбордам, «Контра да Банда» сьпявае, прыкладам, пра футбол), і паўсюль гучыць гіп-гоп.

Недарэчнасьць з афармленьнем — на вокладцы пазначаныя 20 песьняў, а насамрэч іх 18.

**Сяргей Будкін**

Анатоль Сідарэвіч

**50 гадоў пасьля Сталіна**

# Сьмерць тырана



Сталін вельмі баяўся дзьвюх рэчаў: вялікае аўдыторыі і адкрытае прасторы. За сьпінаю ў яго заўсёды былі напагатове Мікалай Уласік і Лаўрэнці Берыя.

У беларускім друку 1920-х яго называлі Язэпам; потым ён зрабіўся казённа-расейскім Іосіфам.

Што яго зваць Іосіфам, я даведаўся з буквара. І не адразу здагадаўся, што ён — цёзка нашым, задубенскім Есіпу, Юзіку і Язэпу. (У вёсцы выкарыстоўваюць усе варыянты імя, каб ня блытаць аднаго чалавека зь іншымі. У суседнім Забярэзьзі (Пінскі раён) адначасна жылі Ясь, Янак, Іван, Іванка і Януш. Ня зблытаеш.)

Да буквара я чуў толькі прозьвішча. Першы раз — ці не 6 сакавіка 1953-га, назаўтра пасьля ягонае сьмерці, бо памёр ён увечары і народу пра гэта паведамілі наранiцу.

Ня помню, каб у нашым Задуб'і хтосьці плакаў. Хіба што настаўнікі, па абавязку службы. Так, у суседніх Малкавічах настаўніца зь мянушкаю Ізраілка падала без прытомнасьці шэсьць разоў. А потым ад аднаго пісьменьніка я чуў, як на Навагрудчыне ў той самы дзень мужык дзяліўся навіною з суседам: «Коля, чуў? Сталіну п...дзец». А ў Смалявіцкім раёне аднаго дырэктара школы ледзь не пасадзілі, бо любіў пасьля доўгага сказу ці пэрыяду казаць «добра». На жалобным мітынгу так і сказаў: «Няўмольная сьмерць забрала ад нас вялікага правадыра і настаўніка, геніяльнага палкаводца Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. Добра. Таварыш Сталін...» За гэтае «добра» і падзяляцеў. У Слуцкім раёне дырэктар школы плакаў: «А як жа мы бяз бацькі жыцьмем?» Дык яго сяляне Бацькам і звалі пасьля. «Знайшоў бацьку», — іранізавалі.

У лягерох зэкі крычалі: «Гуталін загнуўся! Ур-р-ра!» Гуталін — бо бацька генэралісімуса шыў боты, а гуталінам боты чысьцілі. Вось такая была мянушка ў чалавека зь мянушкай Сталін.

Бацькам савецкага народу ён называўся таму, што ў яго былі праблемы з бацькам. Адны казалі, што яго ў часе чарговага падарожжа зрабіў наш Мікола Перавальскі (ён жа — Мікалай Пржавальскі), і раілі супаставіць здымкі «таты» й «сына». Гэтае сьцьверджаньне абвяргалі і супастаўленьнем здымкаў, і спасылкаю на тое, што грузінкі ахоўваюца больш строга, чым беларускі, і чужым мужыкам практычна не даюць. Каторы больш дасьведчаны, дык той казаў: «Сасо Джугашвілі пры жывым законным бацьку быў як байструк. Бацька ягоны — п'яніца — лупцаваў і жонку, і сына». А ўжо каторы з нахілам да псыхааналізу, дык той гаварыў: «Ня ведаў нармальнага бацькоўства, дык ахвочы быў стаць бацькам для іншых. А як ня ведаў бацькавай ласкі, дык і быў жорсткі. Што да родных дзяцей, што да ўсяго народу...»

Маё пакаленьне можа пахваліцца двума самазванымі татамі. А старэйшыя, хто пажыў пад Польшчаю, яшчэ і самазваным дзядулем Пілсудзкім. Наагул, у дыктатараў відавочнае імкненьне навязвацца ў родзічы да ўсіх грамадзянаў. Вось і дзядзечка Хо... А на Гаіці ў татулі Дзювальё тытул дзядзечкаў мелі гаваларэзы — тантон-макуты.

Мне і маім аднагодкам яшчэ «пашчасьціла» разглядаць партрэт Іосіфа ў буквары. Пасьля там пакінулі былі адно Леніна, Купалу ды Коласа.

Разглядаючы на печы партрэт вусатага правадыра ў пагонах, я шчэ ня ведаў, як яго прыхарошвалі. Ня ведаў, што, бадай, усе дыктатары любяць вайсковую ці паўвайсковую форму. І Ленін (пад канец жыцьця нешта накшталт мілітарнага адзеў), і Мао, і Кім, і Кастра... Сталін любіў мундзір з гербам на плячох. Як потым выявілася, гэтая манія заразная і перадаецца ў спадчыну.



Дыктатары любяць гуляць у вайну. Калі не хапае сілаў рабіць гэта на міжнародным арэне, развязваюць яе ва ўласнай краіне. І вядуць яе зацята, да апошніх дзён жыцьця. Псыхолягі кажуць, што гэта — ад ненармальнага дзяцінства. Гітлера тата біў, Сталіна тата біў... Яшчэ псыхолягі кажуць — ад творчае бездапаможнасьці. Няўдалыя паэты Джугашвілі, Мао, Хо... Няўдалы мастак Гітлер... І любоў да казармавага парадку ў краіне таксама бярэ пачатак у непаўнавартасным маленстве і ў няспраўджаных творчых амбіцыях. І жаданьне паставіць у шыхт людзей творчых — пісьменьнікаў, музыкаў, мастакоў, навукоўцаў. І сталая варожасьць да іх, перасьледы, турмы, высылкі, зьбіцьцё, забойствы.

У Сталіна любоў да мундзіра дыктавалася й фізычным недахопам — сухарукасьцю. Дзеля гэтага ён быў белабілетнікам. На вайну яго не ўзялі. Ды яшчэ ў ссылку трапіў.

З тае ссылкі стала ведама ў партыі, што таварыш Коба — інтэлектуальны гультай. Леў Каменеў прапанаваў таварышу Сталіну: «Іосіф, давайце я вас нямецкай мове навучу». І пачуў: «А навошта?» Гэтае пытаньне — «А навошта?» — потым пачуюць тысячы савецкіх грамадзянаў: «А навошта гэта вы, грамадзянін К., французскую (нямецкую, ангельскую і г.д.) мову вучыце?» А колькі аматараў эспэранта трапяць за калючы дрот?

З усяго багацьця марксізму Сталін выціснуў, як заўважыў Мілан Кундэра, шэсьць-сем прасьценькіх тэзісаў і паднёс іх як ісьціну ў апошняй інстанцыі. Вывучэньне філязофіі ў СССР перастала быць неабходным: студэнты й асьпіранты засвойвалі дадатак да кароткага курсу гісторыі ЎсеКП(б) і лічыліся адукаванымі людзьмі. І калі ў вайну й пасьля вайны Сталіну заманулася вярнуць у армію ды на флёт пагоны, а ў сярэднюю школу — разьдзельнае навучаньне хлопчыкаў і дзяўчынак, форму на падабенства гімназічнае, вырашана было вярнуць і курс лёгікі. Дык вось, у БССР не было ніводнага адмыслоўца ў гэтай дысцыпліне. І з Масквы ў Менск, у БДУ, езьдзіў начытваць лекцыі аскалепак старое школы, знакаміты прафэсар Маскоўскага ўнівэрсытэту Валянцін Асмус (той, што выступаў на пахаваньні Барыса Пастарнака).

У «карыфэя» было адпаведнае атачэньне, адпаведная партыя. У КП(б)Б у 1927 г. — на пачатку «разгорнутага будаўніцтва сацыялізму» — 90,8 % сяброў партыі мелі пачатковую адукацыю або ня мелі ніякае. І кіравалі гаспадаркаю, культураю, і вырашалі лёс навукоўцаў, інтэлігенцыі. Бальшавік — гэта нахаба, які без адпаведнае кваліфікацыі бярэцца меркаваць пра ўсё: пра навуку, спорт, літаратуру, мастацтва, сельскую гаспадарку, фінансы... Індустрыялізацыю ў БССР пачалі, маючы на 100 работнікаў аднаго тэхніка або — у найлепшым разе — інжынэра. Адказнасьць за ўсе няўдачы, правалы, катастрофы сьпісвалі на «спэцоў», на інтэлігенцыю.

Калі ў чалавека няма інтэлекту, яму дадзена хітрасьць. Трэба ўлічыць, што Сталін — дзіця Ўсходу. Праваслаўнага Ўсходу. І таму ў бізантыйскіх гульнях ён быў спэц. Гэтага не заўважыў Леў Троцкі, які лічыў Сталіна геніяльнаю пасрэднасьцю. І Бухарын. Бухарын — любімец Леніна і партыі — бываў у хворага правадыра не радзей, чым Сталін. Але не здагадаўся нарабіць здымкаў зь ім. І Троцкі, і іншыя не здагадаліся. А Сталін — здагадаўся. Тут і тое ролю адыграла, што асобы з таталітарным нахілам любяць фатаграфавацца, здымацца ў кіно. Трымаюць пры сабе фатографаў, апэратараў, якія ўвесь час жывуць у напрузе, рызыкуючь здароўем і жыцьцём.

Хітрасьць дапамагла Сталіну ўскарабкацца на палітычны алімп. Сын праваслаўнага Ўсходу, які вядзе свой радавод ад Бізантыі, ён ведаў, як утрымліваць уладу. Ці не ў падзяку за навуку ён у 1940-х пакліకаў да сябе трох незабітых мітрапалітаў — Сергія, Аляксія і Мікалая — і дазволіў ім правесьці Сабор Рускае (не Расійскае, як было раней, а Рускае) Царквы, каб паставіць Патрыярха (не абраць — паставіць)? І ці не таму побач зь ведамствам у справах усіх рэлігій у СССР было створана асобнае ведамства ў справах праваслаўя? Як сярод усіх роўных народаў СССР ён вылучыў самы роўны, так і сярод рэлігій — асаблівую.

Сын Усходу, ён добра ведаў, як прыбіраюць з дарогі дэспатаў. Наш зямляк, генэрал Мікалай Уласік давёў ягоную ахову да дасканаласьці. Сталін вельмі баяўся дзьвюх рэчаў: вялікае аўдыторыі і адкрытае прасторы. Ён, як і кожны дыктатар, быў асобаю маналягічнаю, няздольнаю весьці раўнапраўны дыялёг, асабліва ў вялікай аўдыторыі. Дый вялікую аўдыторыю нават Уласікавы хлопцы не маглі дасканала праверыць на наяўнасьць зброі. Вось чаму Сталін вельмі рэдка выступаў у вялікіх залях.

Урэшце ягоная жыцьцёвая прастора звузілася да кабінэту й кватэркі ў Крамлі, аўтамабіля й пары пакояў на дачы. Шырэйшага сьвету ён ня бачыў. Зь сяброў Прэзыдыюму ЦК і Саўміну ён меў сталыя кантакты толькі з чатырма: Лаўрэнціем Берыем, Мікалаем Булганіным, Георгіем Малянковым і Мікітам Хрушчовым. Ад іх і залежала ягонае жыцьцё. Аднойчы, калі ўдарыў чарговы інсульт, вучні й паплечнікі пазбавілі яго мэдычнае дапамогі.

А праз колькі дзён на Навагрудчыне адбыўся дыялёг.

— Коля, ты чуў?

— Што?

— Сталіну п...дзец.

Пасьля сьмерці дыктатара ў кожнай краіне адбываецца падобны дыялёг. Хтосьці й паплача. А часьцей гэта бываюць сьлёзы палёгкі: нарэшце яго няма, нарэшце перасталі дрыжаць за сваё жыцьцё і жыцьцё сваіх блізкіх. І тая Ізраілка мо ад радасьці прытомнасьць трацiла. І такое бывае.

Працяг са старонкі 2.

Гэтая заканамернасьць дзейнічае і ў Беларусі. Гарады, бы «чорныя дзіркі», уцягваюць вяскоўцаў. Цягам апошніх чатырох дзесяцігодзьдзяў у Беларусі доля вясковых кабет у агульнай колькасьці жанчынаў рэпрадуктыўнага веку (15—49 гадоў) скарачалася на 1% у год. У 1959 г. іх было 65%, а ў 1999 г. — толькі 24%. Адзін Менск «усмактаў» пятую частку насельніцтва Беларусі і павялічыўся за 60 гадоў больш чым у сем разоў — ад 240 тыс. у 1939 г. да 1 мільёна 750 тыс. чалавек у 1999 г.

Пачынаючы з 70-х колькасьць вяскоўцаў кожныя пяць гадоў скарачалася на 400 тыс. чалавек. Сёньня яны ня могуць забясьпечыць узнаўленьня насельніцтва ў межах усёй краіны, бо састарэлі. Сярод іх недастаткова дзетародных маці (толькі 580 тыс.). Таму няправільна лічыць, што ўзровень нараджальнасьці падае, бо ўсё беларускае насельніцтва старэе. На сёньня дзетародных маці ў Беларусі амаль 2,5 млн. — гэта болей, чым у 60—70-я, і прыблізна столькі ж, колькі ў 80—90-я, калі назіраўся прырост насельніцтва.

Вясковыя жанчыны, перасяляючыся ў горад, пачынаюць нараджаць менш, чым тыя, што застаюцца. Так, у Беларусі сярод гарадзкога насельніцтва толькі кожная дваццатая жанчына мае траіх і болей дзяцей (5% ад агульнай колькасьці), у той час як у вёсцы — кожная пятая (20%). Шэсьць зь дзесяці жанчын у горадзе маюць адно дзіця ці ня маюць дзяцей наагул, тады як у вёсцы такіх толькі чатыры зь дзесяці. Чым буйнейшы населены пункт, тым меней у ім дзяцей на адну жанчыну. Так, у Менску гэтая лічба складае 1,0, у абласных цэнтрах — 1,1, у гарадах-стотысячніках — 1,2, у гарадах-пяцідзесяцітысячніках — 1,3, у вёсках — 1,8.

Такія працэсы ўласьцівыя ўсёй Эўропе. Яна моцна абязьлюдзела б, каб не прыток імігрантаў. У краінах з жорсткім міграцыйным заканадаўствам колькасьць жыхароў зьмяншаецца. А ў Беларусі міграцыйныя патокі не кампэнсуюць нізкай нараджальнасьці гарадзкога насельніцтва.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Зьмяншэньне нараджальнасьці не абумоўлена пагаршэньнем узроўню жыцьця. Скарачэньне колькасьці насельніцтва сьведчыць пра пераход нацыі ў шэраг высокаразьвітых.

# Скарачэньне насельніцтва — гэта нармальна

## Не крызыс, а стабілізацыя

Зьмяншэньне нараджальнасьці не абумоўлена пагаршэньнем узроўню жыцьця. У беларускай вёсцы ўзровень жыцьця і разьвіцьця інфраструктуры ніжэйшы, а нараджальнасьць — вышэйшая. З сусьветнай практыкі вядома: чым бяднейшая краіна, тым вышэйшая ў ёй нараджальнасьць. І наадварот — чым вышэйшы ўзровень ВУП на душу насельніцтва, тым меншая колькасьць народжаных дзяцей на адну жанчыну.

У Беларусі, як і ў разьвітых эўрапейскіх краінах, найчасьцей сустракаюцца адна-, двух- і трохдзетныя сем'і. Сярод сем'яў зь дзецьмі да 18 гадоў адно дзіця маюць 59%, дваіх — 35%, траіх і болей — 6%. Гэта азначае, што беларусы знаходзяцца на этапе стабілізацыі колькасьці нацыі. Мы дасягнулі яго крыху пазьней, чым Брытанія, Францыя, Нідэрлянды, але амаль адначасова з краінамі Балтыі і Скандынавіі.

Скарачэньне колькасьці насельніцтва ў Беларусі, з аднаго боку, абумоўлена вычарпаньнем міграцыйных патокаў зь сяла ў горад, якое раней ці пазьней павінна было здарыцца, а з другога боку, можа сьведчыць пра пераход нацыі ў шэраг высокаразьвітых (у разуменьні даступнасьці для большасьці насельніцтва гарадзкой інфраструктуры і стандартаў, якія забясьпечвае спажываньне тавараў разьвітых краін).

Аргумэнты скептыкаў (кепскае мэдабслугоўваньне, стрэсы, адсутнасьць побытавых умоваў для нараджэньня дзяцей), якімі яны тлумачаць рост сьмяротнасьці і зьніжэньне нараджальнасьці, заснаваныя на нэгатыўным успрыняцьці сацыяльна-эканамічных пераўтварэньняў у бок рынкавых адносінаў. Аргумэнты аптымістаў у пляне навуковай абгрунтаванасьці раўназначныя. Маўляў, цяпер за грошы даступныя любыя мэдычныя паслугі й лекі, жыцьцё ва ўмовах няпэўнасьці і рызыкі — нармальная зьява і г.д.

Не знаходзіць пацьверджаньня і думка, быццам нараджальнасьць падае дзеля пагаршэньня экалягічнага становішча ў краіне. Наадварот, статыстыка сьведчыць, што ў раёнах з высокім радыеактыўным забруджаньнем узровень нараджальнасьці большы, чым па краіне ў цэлым. Маладыя сем'і атрымліваюць фінансавую дапамогу зь дзяржбюджэту і застаюцца ў «зоне». Самая нізкая нараджальнасьць — на Віцебшчыне, якая, як лічыцца, менш за іншыя пацярпела ад аварыі на ЧАЭС.

У друку неаднойчы зьяўлялася інфармацыя пра павелічэньне колькасьці жанчын з гарманальнымі парушэньнямі ў забруджаных раёнах. Аднак дакладна вядома, што такой статыстыкі на нацыянальным узроўні не вядзецца і ўсе размовы на гэтую тэму маюць статус дапушчэньняў.

## Людзі як саранча

Каб высьветліць, чаму ў буйных гарадах нараджаюць менш, чым у невялікіх, а ў малых гарадах менш, чым у вёсцы, зьвернемся да навукі, што завецца «эталёгія». Яна вывучае паводзіны жывёлаў, што жывуць у групах (у тым ліку і чалавека як найбольш сацыяльна арганізаванай істоты). Навукоўцы-этолягі вызначылі, што так званая скупаванасьць уласьцівая ня толькі чалавеку, але й іншым відам сацыяльных жывёл. Прыкладам, калі шчыльнасьць папуляцыі саранчы дасягае крытычнага значэньня адносна наяўнай расьліннай масы, самкі пачынаюць адкладаць яйкі, зь якіх выходзіць «паходнае» патомства. Новыя асобіны зьбіраюцца ў вялізныя групы і мігруюць, шукаючы ежы. У такіх групах яны альбо ня плодзяцца зусім, альбо плодзяцца абмежавана — меней, чым тэба для ўзнаўленьня. У прыродзе ёсьць такія віды вусякоў, якія ва ўмовах павышанай скупаванасьці кідаюць ня толькі пладзіцца, але нават харчавацца. «Так і людзі»: жорсткая канкурэнцыя на маленькай тэрыторыі ўвесь час сее ў падсьвядомасьці боязь, што ты і твае дзеці акажуцца «лішнімі». Дык няхай жа іх будзе меней.

Другая прычына, якая ўплывае на ўзровень нараджальнасьці болей, чым матэрыяльны дастатак, — гэта ўзровень сьмяротнасьці. Спытайце жанчыну: ці плянавала б яна наступнае дзіця, калі б не была пэўная, што тое, якое ўжо ёсьць, дажыве да паўналецьця? Яна адкажа станоўча. Ад 1945 г. каэфіцыент сьмяротнасьці ў дзяцінстве ў Беларусі зьменшыўся амаль у восем разоў — з 67 да 9 чалавек на 1000 народжаных у 2000 г. Паралельна зьніжэньню дзіцячай сьмяротнасьці падала нараджальнасьць: ад 27 у 1945 г. да 16 у 1970 г. і 10 народжаных на тысячу жыхароў у 2000 г. Каэфіцыент пэрынатальнай сьмяротнасьці (на 1000 народжаных жывымі і мёртвымі) у Беларусі таксама скараціўся: з 15 чалавек у 1980 г. да 7 у 2000 г.

Такім чынам, нараджальнасьць вызначаецца закладзенымі ў людзях прыроджанымі праграмамі паводзінаў і рэгулюецца ў залежнасьці ад шчыльнасьці насельніцтва і ўзроўню дзіцячай сьмяротнасьці ў краіне. Жыцьцёвы ўзровень на нараджальнасьць мала ўплывае.

## Галоўнае не мільёны

Сапраўдныя прычыны скарачэньня колькасьці насельніцтва важна ведаць дзеля таго, каб распрацаваць эфэктыўную дэмаграфічную палітыку.

Урады розных краін, каб зьменшыць міграцыю зь вёскі ў горад, выдаткоўвалі значныя бюджэтныя сродкі на разьвіцьцё вясковай інфраструктуры і атрымлівалі адваротны эфэкт. Бо вяскоўцы дазнаваліся пра дадатковыя магчымасьці, якія можа даць жыцьцё ў мэгаполісе.

Гэта па-іншаму прымушае зірнуць на праблему дэградацыі сельскай мясцовасьці ў Беларусі. Яе прычынай быў не адток насельніцтва ў гарады (што звычайна тлумачыцца індустрыялізацыяй у другой палове XX ст). У некаторых разьвітых эўрапейскіх краінах доля сельскага насельніцтва складае 4—5% і яно няблага дае рады вытворчасьці неабходнага аб'ёму харчаваньня для гораду (у Беларусі вяскоўцаў цяпер 29%). Дэградацыю сельскай мясцовасьці перадвызначыла калгасна-саўгасная сыстэма гаспадараньня, якая б'ецца ў агоніі да сёньня.

Зьяўляюцца меркаваньні, што скарачэньне колькасьці насельніцтва трэба разглядаць як пагрозу эканамічнай бясьпецы Беларусі. На мой погляд, нават калі разьвіцьцё пойдзе па самым пэсымістычным сцэнары і да канца гэтага стагодзьдзя насельніцтва Беларусі скароціцца напалову, нічога страшнага не адбудзецца. Бальшыня людзей у буйных гарадах гэтага нават не заўважыць.

Праблема ня ў колькасьці насельніцтва, а ў стварэньні грамадзянам краіны ўмоваў, паводле нямецкага эканаміста Вальтэра Ойкена, «вартых чалавека». Тады ў сельскай мясцовасьці будуць заставацца тутэйшыя і сяліцца новыя жыхары. Фінансавая дапамога сялу павінна быць адрасаваная канкрэтным людзям, якія маюць у ёй патрэбу, а не абстрактнай «сельскай гаспадарцы» — неэфэктыўнай сельскагаспадарчай вытворчасьці на аснове грамадзкай уласнасьці.

Посьпехі на сусьветнай арэне ў спорце, культуры, эканоміцы, палітыцы не залежаць ад велічыні нацыі. У пяцімільённай Фінляндыі ў дзясяткі разоў больш лядовых арэнаў, чым у 10-мільённай Беларусі і, адпаведна, болей фінаў займаюцца хакеем, чым беларусаў. Таму перамогі зборнай Беларусі накшталт той, што была на апошняй Алімпіядзе над зборнай 8-мільённай Швэцыі, яшчэ доўга будуць расцэньвацца як сэнсацыі.

Узровень жыцьця і стандарты ў краіне галоўным чынам залежаць ад узроўню вытворчасьці тэхналёгіяў грамадзтва і ад таго, наколькі разумна арганізаванае яго эканамічнае жыцьцё.

**Уладзь Калупаеў, кандыдат эканамічных навук**

# Аголеная Беларусь у Нэце


АЛЕНА АДАМЧЫХА

**Адрэстаўраваны старажытны слуцкі пояс і аголеная жанчына — эротыка па-беларуску**

**Працяг са старонкі 1.**

Гэткі сьціплы намёк на першую «беларусьфільмаўскую» эратычную кінасцэну — у экранізацыі «Дзікага паляваньня караля Стаха». Сайт Беларэцкага падкрэсьлена эстэцкі, насычаны алюзіямі на творы беларускага мастацтва й літаратуры. Тут ёсьць творы, якія пры ўсім жаданьні ніяк не назавеш эратычнымі. Мовы сайту — беларуская (лацінкаю) і ангельская. Праўда, сам «Андрэй Беларэцкі» на адным з інтэрнэт-форумаў прызнаўся, што гэты сайт дзя яго — ня болей чым гульня.

Мастацкае напаўненьне інтэрнэт-рэсурсу толькі пацьвярджае ягоны «культурна-гульнёвы» характар. Аматарскія фоткі ў жанры «ню» (то бок, з аголенай «натурай») суседзяць з працамі Алены Адамчыхі. Творы Рона, якія нечым нагадваюць Шчамялёва і Рэрыха, — і карціны Алеся Пушкіна. Ёсьць там нават партрэт Барбары Радзівіл. Што праўда, слынная каралева на ім — не аголеная. Але выглядае вельмі эратычна.

## Такую можна і пакахаць

Стваральніца (стваральнік?) «Беларускае прыгажосьці» хаваецца за псэўданімам «Алена Філістовіч». (Славутага «парашутыста», што дэсантаваўся, каб узьняць маладэчанцаў на антысталінскае паўстаньне, звалі Янкам Філістовічам.) Сайт, паводле ейных словаў, прысьвячаецца «дзявочаму хараству й магічнай сэксуальнасьці Беларусі». Столькі гаворыць, што «найпрыгажэйшыя ў сьвеце — беларускія дзяўчаты». А тут што ні здымак, то доказ.

У адрозьненьне ад «Аголенае Беларусі», тут толькі фоткі й зусім трошкі малюнкаў — аніякіх карцінаў. Подпісы да здымкаў (як і ўсё астатняе афармленьне) падаюцца паралельна па-беларуску й па-ангельску. Беларускі тэкст ідзе клясычным правапісам.

Мастацкасьці нават у аматарскіх фатаздымках тут значна болей, чым у Беларэцкага. Фонавыя пэйзажы: мора, поле, лес — глядзяцца прыгажэй, чым набор «кватэрных» фотак, якімі перапоўнены сайт «Аголеная Беларусь». Да таго ж «Беларуская прыгажосьць» зьмяшчае рэклямныя здымкі мадэлек з агенцтваў «Тамара», «The Real Models», «Вэльф». Ёсьць і рэкляма фірмы «Мілавіца». Якая ж беларуская эротыка безь «Мілавіцы»?

Выказаць свае ўражаньні пра сфатаграфаваных прыгажуняў наведнікі могуць на форуме. Большасьць камэнтароў — мужчынскія. Нават самі мадэлькі туды заглядаюць крайне рэдка. З запісаў зьвяртаюць на сябе ўвагу такія: «Такую і пакахаць можна», «Lepshaja na hetym saice!!! Nyama slou». Бальшыня камэнтароў па-расейску. Сустракаюцца і ангельска-, і польска-, і нават франкамоўныя запісы.

## Панчохі чырвона-зялёныя

Дальбог, гэтага сайту можна было б і ня згадваць, аднак дзеля паўнаты агляду…

Сам па сабе ён мае тры вэрсіі — беларускую, расейскую й ангельскую. Наведнік знойдзе на сайце і фатаздымкі, і падборку тэкстаў. Аповеды — толькі расейскамоўныя й болей выдаюць на нізкаякасную парнаграфію, чым на Мілера ці Набокава.



Беларускай мовы на сайце мала, хіба ў інтэрфэйсе. Уваход на беларускамоўную старонку пазначаецца чырвона-зялёным сьцяжком. Фатаздымкі на сайце яўна «скачаныя» зь іншых сэрвэраў — чэскіх ды расейскіх. Сем галерэяў з фоткамі «жанчынаў у панчохах» (як «натуралак», так і аматарак «лесьбі») — вось асноўная «разынка» рэсурсу. Сайт яўна прайграе двум першым — не адчуваецца ў ім ані гульні, ані шарму, якія ёсьць у рэсурсах Беларэцкага й Філістовіч. Чыстая жывёльнасьць. Але ёсьць жа, відаць, аматары і на такія відовішчы. Вінаваціць іх у «схільнасьці да парнаграфіі» ня буду. Бо, як афарыстычна выказалася з гэтае нагоды Алена Адамчык, «эротыка — гэта панятак эстэтычны, а парнаграфія — гэта артыкул у Крымінальным кодэксе».

## Аўтарскае лева



На Інтэрнэт ува ўсім сьвеце наракаюць за парушэньні аўтарскага права. Беларускія эратычныя web-старонкі ня ёсьць выняткам з гэтага сумнага шэрагу. Для А.Пушкіна і А.Адамчыхі сталася неспадзяванкай зьяўленьне іхных твораў на сайтах «Аголеная Беларусь» і «Беларуская прыгажосьць». Паставіліся мастакі да гэтага па-рознаму. Славуты пэрформэр узрадаваўся ўласнай вядомасьці: «Перадайце падзяку гэтаму чалавеку за папулярызацыю творчасьці Пушкіна!»

Катэгарычна пратэстуе супраць выкарыстаньня сваіх здымкаў А.Адамчыха: «Карціны, кнігі, скульптура — не рэклямная прадукцыя. Таму іх зьяўленьне ў Інтэрнэце — гэта ў пэўнай ступені прамоцыя аўтару. А фатаздымак ёсьць рэклямай. Таму яго зьмяшчэньне бязь ведама аўтара — гэта крадзеж. Эратычныя здымкі крадуць для таго, каб прыцягнуць увагу наведнікаў да свайго сайту. Ёсьць людзі, якія ствараюць кнігі, карціны, скульптуры, а ёсьць тыя, хто паразытуе на гэтым». Яе не суцяшае абяцаньне «Алены Філістовіч» прыбраць выявы, калі будзе заяўлена пра аўтарскія правы: «Я што, павінна адсочваць ва ўсім Інтэрнэце, ці не зьявіліся дзе мае працы?»

Сваё абурэньне выказала і Вольга, адна з фотамадэлек спн.Алены. Дзяўчыну прываблівае вонкавы антураж прафэсіі: «Многія дзяўчаты мараць стаць фотамадэлямі, бо можна мяняць вобраз, быць рознай. І ўвесь час — прыгожай. І мець надзею, што гэта нехта ўбачыць і ацэніць». Аднак тое, што такая рамантыка можа мець і непрыемны бок, яе бянтэжыць: «Мне б не хацелася, каб мае аголеныя фатаздымкі зьяўляліся недзе ў Інтэрнэце».

## Грэх ці ня грэх?

Ці можна наведваць сайты такога кшталту? Ці маральна выглядаюць іхныя стваральнікі? З пункту гледжаньня Крымінальнага кодэксу, злачынства няма, пакуль эротыка не саступае месца парнаграфіі. А з гледзішча маралі?

Уніяцкі сьвятар айцец Андрэй (Абламейка) зазначыў, што ні сама па сабе выява аголенае жанчыны, ані ейнае сузіраньне ня ёсьць грахом: «Калі гэтая выява ствараецца дзеля плоцевай уцехі, тады гэта грэх. А калі дзеля мастацтва, тады да гэтай карціны ці фатаздымку нельга ставіцца як да граху». Словам, кожны сам для сябе мусіць вырашаць, дзеля чаго ён «залазіць» на эратычны сайт.

У нашым кансэрватыўным грамадзтве аўтару такога сайту лёгка займець рэпутацыю «вычварэнца». Таму стваральнікі эратычных рэсурсаў хаваюцца за псэўданімамі і на кантакт з журналістамі ня йдуць. Андрэй Беларэцкі, зь якім мне ўдалося скантактавацца па электроннай пошце, нэрвова адказаў, што сайт — гульня й нічога болей, і ўвогуле, ня варта пра гэта гаварыць.

Але хіба такое магчыма — каб мужчыны перасталі гаварыць пра жанчын?

**Аркадзь Шанскі**

**ВІТАНЬНІ**

**Віншуем усіх** беларускіх патрыётаў з 140-й гадавінай паўстаньня супраць маскоўскіх акупантаў. Змаганьне доўжыцца! Аднадумцы з Рэчыцы

**КАЛЬКУЛЯТАР**

**Куплю калькулятары** «Электроніка» ў добрым стане. Т.: 201-60-57

**КАНТАКТЫ**

**Янка Купала** з намі! Кожную нядзелю а 13-й каля помніка чытаем вершы нашых прарокаў

**Сярожкіну**. Узнагароды Беларусі — справа ўлады, але чаму б і не. Шукайце грошы на паліграфію. Сінчук

**Дзякуй Міколу Нязломнаму** за тэлефанаваньне 18 лютага на «Голас Амэрыкі». Той, хто слухаў

**«Стары Ольса»** сумесна з «ВМА group» у сакавіку зладзіць сярэднявечную дыскатэку ў клюбе «Тунэль». Т.: 289-31-94

**Беларуская** Партыя Свабоды кліча ўсіх, хто здатны трымаць меч змаганьня за Свабоду! У Менску: 211-00-00, аб.83602

**«Хутчэй бы Амэрыка** разабралася з Іракам і тады б узялася за Лукашэнку» — так, сп.Дубавец, мяркуюць самыя звычайныя берасьцейцы. Калі шчыра, ужо прытамілі Вашыя артыкулы, дзе беларусы паўстаюць гэткімі пускаючымі сьліну імбэцыламі!

**Кіруючыся лёгікай** сп.Булгакава, сучасных нацыяналістаў, праціўнікаў антынацыянальнай палітыкі, можна лічыць патэнцыйнымі калябарантамі. З.Цярэнцьеў

**Шаноўныя** псэўдапацыфісты! Замест абароны рэжыму Садама Хусэйна лепш абараніце дзяцей ад прызыву ў войска! Пікетуйце 23 лютага!

**Дзе ў Віцебску** можна набыць запісы беларускамоўных выканаўцаў на CD альбо аўдыёкасэтах? Асабліва «Крамы». Ігар

**КВАТЭРА**

**Здыму** кватэру ў Менску. Прыстойнасьць і акуратнасьць гарантую. Т.: (8-0296) 47-71-12. E-mail: andrus_s@tut.by

**ПРАЦА**

**Патрэбны малады чалавек** для працы ў Менску кур'ерам па дастаўцы кампакт-дыскаў. contact@belinter.net

**Высокаадукаваны** баяніст шукае працу ўлетку. А/с 26, 220047, Менск

**Шукаю годную працу** ў беларускамоўным асяродку. Неблагое веданьне жывое пісьмовае ангельскае мовы, валоданьне кампутарам на крыху большым ад карыстальніцкага ўзроўні, адданасьць беларускай справе. Т.: 258-92-79. E-mail: liuciez@tut.by

**Французская мова**: пераклады, заняткі для маленькіх і дарослых. Вольга, студэнтка V курсу МДЛУ. Т.: (8-0297) 50-99-37, 270-57-58

Шчыра спачуваем Рэгіне Ждановіч у сувязі зь сьмерцю сына Ясіка. Сябры, знаёмыя.

**4 сакавіка** ў Вялікай залі Дому літаратара адбудзецца вечарына, прысьвечаная **195-годзьдзю В.Дуніна-Марцінкевіча**, з удзелам ягоных нашчадкаў з Польшчы і ЗША. Пачатак а 18-й.




ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

# Да 10-годзьдзя пасольства ў Менску

**Японскае кіно для беларусаў адкрылі традыцыйныя штогадовыя фэсты японскага кінамастацтва. Нетаропкасьцю аповеду японскія фільмы падобныя да беларускіх. Сёлетні кінафэст мае назоў «Хрызантэмы апошніх дзён». Ён прымеркаваны да 10-годзьдзя адкрыцьця пасольства Японіі ў Беларусі.**

Хто набудзе газэту ў чацьвер, пасьпее ў менскім кінатэатры «Перамога» паглядзець чацьвертую стужку Такешы Кітана **«Санаціна»**. Гэта гангстэрская сага. Бос бандытаў накіроўвае свайго чалавека на Акінаву. Той трапляе ў самы вір гангстэрскіх «разборак». У нетаропкай манеры «назіральніка збоку», з доляю арыгінальнага гумару Кітана вядзе гаворку на тэму сьмерці. У 1993 г. фільм дэманстраваўся ў Канах у разьдзеле палемічных кінастужак.

У пятніцу — **«Краіна мёртвых»** Сюньіці Нагасакі, псыхалягічны трылер у найлепшых традыцыях жанру. Хінака вяртаецца ў вёску, дзе прайшло яе маленства. А там — трагедыя: памерла сяброўка. Хінака знаёміцца з былым каханкам сяброўкі, між імі паступова нараджаецца пачуцьцё. Усё б добра, але нябожчыца імкнецца вырвацца з краіны мёртвых, каб пабачыць каханага.

Абодва фільмы пачынаюцца а 19-й. А ў суботу а 13-й — дзіцячы мультфільм **«Астрабой»** рэжысэра Асамы Тэдзукі — гісторыя прыгодаў хлопчыка-робата з надзвычайнымі здольнасьцямі.

Пасьля кінафэст пераедзе ў Магілёў. 5 сакавіка там пакажуць крымінальную трагікамэдыю Сінобу Ягуці **«Адрэналінавая гонка»**. Машына простага клерка ўрэзалася ў «ягуар» Кураівы — аднаго з босаў мафіі. Якудза цягне небараку ў бар — абмеркаваць магчымасьці «кампэнсацыі стратаў». Бар узрываецца, а клерк, ачомаўшыся сярод руінаў, знаходзіць 200 мільёнаў бандыцкіх енаў. Але выжыў і Кураіва, які пачынае паляваньне на беднага клерка. 6 сакавіка можна будзе паглядзець лірычную мэлядраму рэжысэра Наоты Такэнакі **«Нікчэмны чалавек»** пра жыцьцё японскіх аўтсайдэраў, 7-га — «Санаціну», 8-га — «Краіну мёртвых», а скончыцца фэст 9 сакавіка «Астра-боем».

**Уладзімер Пучынскі**






IN MEMORIAM

# Памяць жыцьме

У нас на Вушаччыне любілі казаць: ад роду ня ў воду.

Крывічы шануюць свой род, свае сямейныя повязі. Уладзімер Караткевіч прыйшоў у беларускую літаратуру, каб узьняць яе да эўрапейскага ўзроўню, — князь прыўкраснага крывіцкага пісьменства Ўладзімер са слыннага крывіцкага роду.

Адышла сястра Ўладзімера Караткевіча Натальля. Гэта яна грэла думкі ягоныя, клапацілася аб ім. Памяць аб ёй жыцьме ў творах геніяльнага брата і ў сэрцах усіх, каму дарагая вольная незалежная Беларусь.

**Рыгор Барадулін**

# Пісаў у шуфляду

**У Слоніме памёр паэт і краязнаўца, 73-гадовы Ўладзімер Шундрык.** Гэта быў сьціплы і шчыры чалавек, патрыёт, які пражыў няпростае жыцьцё. У.Шундрык гартаваўся ў шэрагах Саюзу беларускай моладзі ў Слоніме, быў дружыновым. У вайну пачаў ён пісаць вершы і апавяданьні. Не спыняў сваёй творчасьці Шундрык і ў пасьляваенны час, але пісаў у шуфляду. Большасьць рукапісаў яму давялося спаліць, адзін з ацалелых вершаў у верасьні 1999 г. друкавала «НН». Ад пачатку 50-х да выхаду на пэнсію У.Шундрык працаваў настаўнікам, захапляўся краязнаўствам. Па каліву зьбіраў зьвесткі пра паэта-нашаніўца Гальляша Леўчыка. Быў сябрам БНФ.



**Сяргей Ёрш**

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ...

**Пяткевіч А. Маршруты кніжнага слова: З гісторыі кнігі, друку на Гарадзеншчыне**. — Варшава, 2002. — 52 с.

Аляксей Пяткевіч, грунтуючыся на працах беларускіх, расейскіх і польскіх края- ды кнігазнаўцаў, зрабіў агляд кніжнае справы на Гарадзеншчыне ад XIII да пачатку XX ст. У дасьледаваньні вызначаныя асноўныя цэнтры кнігадрукаваньня, названыя майстры выдавецкай справы, пададзеныя зьвесткі пра колькасьць кніжнай прадукцыі. Багата каштоўных краязнаўчых фактаў з гісторыі Жыровічаў, Любчы, Слоніму, Наваградку, Горадні. Наклад 100 ас.

**Разнастайнасьць моваў і культур у кантэксьце глябалізацыі = Diversity of Languages and Cultures in the Context of Globalization**: Матэрыялы Міжнар. сымпозіюму, Менск, 9—10 ліпеня 2002 г.: У 2 кн. Кн. 2 / Рэдкал.: А.Мальдзіс і інш. — Менск: БелСаЭС «Чарнобыль», 2003. — 352 с.

**Штыхаў Г. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі**. — 2-е выд., выпр. — Менск: ВТАА «Правы і эканоміка», 2002. — 94 с.

Пытайцеся ў кнігарні «Веды». Наклад 250 ас.

**Жлоба С. Народная педагогика Полесья: По материалам этнографических исследований** / Берасьцейскі дзярж. ун-т; Навук. рэд. Б.Ляпешка. — Берасьце, 2002. — 328 с.: іл.

Багаты фактычны матэрыял, назапашаны падчас палявых дасьледаваньняў, дазволіў прасачыць мэтады й прыёмы, якія скарыстоўвае этнапэдагогіка для выхаваньня дзяцей рознага ўзросту. У кнізе разглядаецца роля цацак, гульняў, штодзённых ды сьвяточных абрадаў, падаецца ілюстрацыйны матэрыял. Асаблівая ўвага зьвернутая на падлеткавую субкультуру й абрады ініцыяцыі, падкрэсьліваецца скіраванасьць народнай пэдагогікі на выхаваньне свабоднай асобы. Наклад кніжкі — 500 ас., цана ў «Акадэмкнізе» — 7200 руб.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Канцэрт «Клясык-авангарду»

**6 сакавіка ў касьцёле Сьв.Роха (пр.Скарыны, 44а) адбудзецца выступ ансамблю салістаў «Клясык-авангард»** пад кіраўніцтвам Уладзімера Байдава. У праграме: Ян Дзісмас Зяленка — Канцэрт Соль мажор; Люіджы Бакерыні — Сэкстэт Мі бэмоль мажор (першае выкананьне); Муцыё Клемэнці — Нанэт Мі бэмоль мажор (першае выкананьне); Маск Брух — Сэптэт Мі бэмоль мажор (першае выкананьне); Ігар Стравінскі — Сэптэт для клярнэта, фагота, валторны, скрыпкі, альта, віялянчэлі і фартэпіяна (першае выкананьне). Пачатак у 19.00. Квіткі прадаюцца.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Міколу Б. з tut.by.** Працуйце з мовай і стылем.

**Юліі І. зь Менску.** Нататка пра Максіма Гарэцкага нагадвае рэфэрат. Чытач можа знайсьці такую інфармацыю ў даведніках ды падручніках.

**Віктару Д. зь Менску.** Няясна, што рабіць з Вашым лістом. Для «Бясплатных прыватных абвестак» ён завялікі. А хто такі Нашчадак і як перадаць яму Ваш адказ, мы ня ведаем.

**Сяргею Б. з Гомеля.** «Мой родны кіт» выпісаны файна, але для газэты ён завялікі й заскладаны. Мала ў ім жывога гумару, як на гістарычную містыфікацыю. А такі матэрыял абавязкова мусіць выклікаць сьмех — чытаецца лягчэй дый гісторыя праз гэта робіцца бліжэйшай, інтымнейшай.

**П.К. зь Менску.** Вы ня першы, хто хоча стварыць «навуковую рэлігію». У любым разе, гэткіх рэчаў не пачынаюць з газэтнае абвесткі.

«НН» дзякуе за падтрымку сп.Віталю Кажану, Нью-Ёрк.

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Сяргей Ёрш |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, (0296) 13-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3854.

Нумар падпісаны ў друк 26.02.2003.

Замова № 1111.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220050, Менск, а/с 537

**Тэкст** ____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________